

ЛІНІІ ЭЛЕКТРАПЕРАДАЧЫ З ХАТКАМІ ДЛЯ БУСЛОЎ 4

ЧЫМ КАРЫСНАЯ ЛЯНОТА? 9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЛІПЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 126 (29495)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Мы даволі нядрэнна навучыліся працаваць ва ўмовах эпідэмічных абмежаванняў і займаліся прасоўваннем беларускай прадукцыі ў рэжыме анлайн. Цяпер свет вяртаецца да дапандэмійнага рытму жыцця. Праводзяцца выставачныя мерапрыемствы, буйныя міжнародныя форумы і рабочыя сустрэчы. Прадпрыемствы галіны хутка адаптуюцца да змен і імкнуцца максімальна выкарыстоўваць розныя інструменты для пошуку і заключэння новых кантрактаў. Да таго ж нашы будаўнікі сапраўды станоўча зарэкамендавалі сябе на замежных будаўнічых пляцоўках. І гэта заслужана. Так што сёння з упэўненасцю можна сказаць, што Беларусь адкрытая для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з усімі краінамі і мае ўсе неабходныя магчымасці для гэтага».*

# Мінскае лета



**Мінчанка Ала АНАНЕНКА з малодшай дачкой Хрысцінай на сталічнай плошчы Незалежнасці. Ала Валянцінаўна любіць прагулкі, практыкуе здаровы лад жыцця, тым больш што працуе інструктарам у адной з трэнажорных залаў сталіцы. А яе дачка Хрысціна сёлета пойдзе ў першы клас, і гэта лета апошняе перад адказнымі школьнымі заняткамі.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **У Пінску плануецца стварэнне скрынінгавага цэнтра па выяўленні анкалагічных захворванняў.**
- Беларусь і Узбекістан абмеркавалі перспектывы стварэння новых сумесных прадпрыемстваў.
- **Маці ўдалося выратаваць свайго чатырохгадовага сына, які ледзь не патануў у сажалцы.**
- Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў зняты па ўсёй Беларусі.
- **Магілёўскі заапарк арганізаваў дабрачынную акцыю для дзяцей Цэнтра паліятыўнай дапамогі.**
- У Беларусі з 6 ліпеня павышаюцца цэны на аўтамабільнае паліва.


ISSN 1990 — 763X

21126>


Творцы

## САКРЭТ КУПАЛЛЯ РАСКРЫЕ ДРЭВА

### На гэтую тэму пад Бабруйскам ствараюцца чатырохметровыя шэдэўры з дубу

**База адпачынку «Вербкі» бабруйскага прадпрыемства «ФанДАК» з 3 да 9 ліпеня пераўтварылася ў адну вялікую майстэрню пад адкрытым небам. 28 удзельнікаў трэцяга конкурсу-пленэру майстроў-разьбяроў «Пераўвасабленне дрэва» спаборнічаюць тут у прафесійным майстэрстве. Летась гэтыя спаборніцтвы прыйшлося адкласці з-за пандэміі, хоць былі заяўкі нават з Чылі і Мексікі. Пра конкурс ведаюць ужо далёка за межамі, нягледзячы на тое, што ён яшчэ зусім малады. Сёлета прыехалі разьбяры з Беларусі, Венгрыі, Азербайджана, Расіі і Украіны.**

СТАР. 8



Фота з архіва прадпрыемства «ФанДАК».

Актуальнае інтэрв'ю

## «З ЛЮБОЎЮ Ў СЭРЦЫ І АКТЫЎНАЙ ЖЫЦЦЁВАЙ ПАЗІЦЫЯЙ»

### Рэктар БДПУ — пра сучаснага настаўніка, педагагічныя класы і адсутнасць «сіндрому апошняга дня»



Фота прадастаўлена прэс-службай БДПУ.

**Напрыканцы мая рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктар педагагічных навук, прафесар Аляксандр Іванавіч ЖУК быў абраны замежным членам Расійскай акадэміі адукацыі. На якім узроўні знаходзіцца сёння педагагічная навука ў нашай краіне, як развіваецца сістэма бесперапыннай педагагічнай адукацыі і наколькі падрыхтаваныя выпускнікі ўніверсітэта для работы з пакаленнем Z — пра ўсё гэта наша сённяшняя размова.**

### СТАЎКА — НА ПЕДКЛАСЫ

***— Аляксандр Іванавіч, вы былі першым дырэктарам Ліцэя БДУ, першым прарэктарам Белдзяржуніверсітэта, узначальвалі цяперашнюю Акадэмію паслядыпломнай адукацыі, трыццаць гадоў працавалі першым намеснікам міністра адукацыі і вось ужо сем гадоў з'яўляецеся рэктарам БДПУ. Аднойчы вы сказалі, што тон СМІ ў адносінах да прадстаўнікоў педагагічнай прафесіі прыкметна змяніўся. Калі вы гэта адчулі? І калі педагагічныя спецыяльнасці перасталі быць «запасным аэрадромам» для ўладальнікаў не вельмі высокіх балаў у сертыфікатах?***

СТАР. 7

Парламенцкі дзённік

# РАБІЦЬ УСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ ГРАМАДЗЯНЕ БЫЛІ ДУХОЎНА І ФІЗІЧНА ЗДАРОВЫМІ

**Толькі разам улада, царква, грамадскія арганізацыі могуць дасягнуць яшчэ большых поспехаў у прафілактыцы п'янства і алкагалізму сярод насельніцтва**

**У калысцы гарадоў беларускіх — Полацку — у панядзелак на выязным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі абмеркавалі тэму грамадска-дзяржаўнага партнёрства ў вырашэнні праблем п'янства і алкагалізму. Месцам правядзення мерапрыемства, у якім бралі ўдзел і члены ўрада, стаў духоўна-асветніцкі цэнтр Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра.**



Фота БелТА.

Адпаведная дзяржаўная праграма дзейнічае даволі эфектыўна дзякуючы таму, што ёй займаецца не толькі дзяржава, а сярод іншых — праваслаўная царква і іншыя канфесіі, падкрэсліла ва ўступным слове **старшыня верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА.**

На яе погляд, вельмі важна своечасова выявіць, што чалавеку патрэбна дапамога. Залежныя людзі павінны жыць у соцыуме, правільна выхоўваць дзяцей, прыносіць карысць грамадству і краіне.

Адными з асноўных кірункаў у рабоце па прафілактыцы з'яўляецца фарміраванне здаровага ладу жыцця, недапушчэнне залежнасці ад алкаголю, псіхатропных рэчываў, наркотыкаў у дзяцей і падлеткаў.

Пацвярджэннем таго, што ўсё робіцца правільна, з'яўляецца тое, што з кожным годам становіцца ўсё меней залежных ад алкаголю. Памяншаецца колькасць так званых бытавых злачынстваў (а практычна ўсе яны ўчыняюцца ў нецвярозым стане).

**Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН** адзначыў, што мерапрыемства — чарговы крок у справе супрацоўніцтва царквы і ўлады дзеля служэння беларускаму народу. Перавыхаванне тых, хто хварэе на алкагалізм і іншай залежнасці, можна параўнаць з дзейнасцю рэстаўратара душы... На жаль, сям'я, праца, доўг перад Богам у хворага чалавека адступае на іншы план. Кіраўнік Беларускага экзархата падкрэсліў, што ахвярам п'янства вельмі важна часцей за ўсё прапаноўваць духоўную дапамогу разам з псіхалагічнай, урачэбнай. Царква імкнецца спрыяць гэтаму супрацоўніцтву дзеля дасягнення яшчэ большых поспехаў. Ён заклікаў узмацніць работу з моладдзю, каб юнакі і дзяўчаты разумелі ўвесь жах таго, што могуць атрымаць у выніку «сяброўства з зялёным змеем».

**Міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ** канстатаваў, што прафілактычная дзейнасць прынесла вынікі. Напрыклад, грамадзян прывучылі не ўжываць піва на вуліцах, ужыванне алкаголю сярод моладзі стала нямодным.

Вядома, што спіртное — бяда з многімі абліччамі. Выпівохі ўчыняюць злачынствы, проціпраўныя дзеянні супраць членаў сям'і (86 % — у нецвярозым стане), і галоўным чынам ад гэтага церпяць дзеці. Толькі сёлета ў сацыяльна небяспечным становішчы аказаліся каля пяці тысяч дзяцей — з-за п'янства бацькоў. Каля шасцісот дзяцей ужо не жывуць з горабацькамі. Як падкрэсліў міністр, выхоўваць залежных атрымліваецца вельмі ўдала, калі гэта робяць не толькі праваахоўныя органы, але і работнікі сістэмы адукацыі, сацыяльнай абароны, грамадскія арганізацыі і прадстаўнікі царквы. Вельмі плённа супрацоўніцтва наладжана з актывістамі таварыства ананімных алкаголікаў, беларускім Чырвоным Крыжам. Трэба ўзмацніць выхаваўчую ролю працоўных калектываў і прафсаюза.

Гэтую ідэю падтрымала Наталля Качанава і нагадала найлепшае з савецкага вопыту.

**Міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ** падкрэсліў, што беларускія медыкі маюць добры вопыт у лячэнні і прафілактыцы. Але апошнюю трэба ўзмацніць. Неабходна весці прапаганду таго, што здароўе — гэта каштоўнасць, якую лёгка страціць. А вось шкода ад спіртнога можа быць вельмі небяспечнай для здароўя і жыцця. На сёння выклікае асаблівы клопат стан здароўя каля 30 тысяч грамадзян Беларусі, якія залежныя ад алкаголю.

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** упэўнены, што шчыльнае ўзаемадзеянне паміж міністэрствамі і ведамствамі, царквой і грамадскімі арганізацыямі гарантуе паспяховую прафілактыку п'янства. Каб дзеці ведалі пра шкоду спіртнога, веды яны атрымліваюць на факультатыўных занятках.

Занятасць дзяцей спортам, у гуртках мастацкай самадзейнасці і іншымі карыснымі справамі гарантуе, што яны будуць весці здаровы лад жыцця. Але міністр упэўнены, што гэтага недастаткова — трэба весці адукацыйную работу і ў сем'ях.

У гутарцы з журналістамі Наталля Качанава адзначыла, што пліннае супрацоўніцтва з БПЦ вядзецца даўно. Грамадскія арганізацыі і дэпутаты павінны рабіць усё магчымае, каб грамадзяне былі духоўна і фізічна здаровымі. І трэба клапаціцца ў першую чаргу пра дзяцей, якім не пашанцавала жыць у надзейных сем'ях. Шмат зроблена па паніжэнні колькасці залежных ад спіртнога і наркотыкаў. Але трэба працаваць яшчэ больш без фармалізму і раўнадушша. Трэба ўсебакова яшчэ глыбей вывучаць праблему і вырашаць яе комплексна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

---

**Андрэй САВІНЫХ:**

# «НЕ ДАПУСЦІЦЬ НОВЫХ РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫХ ЛІНІЙ У ЕЎРОПЕ»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ узяў удзел у пасяджэнні Агульнага камітэта Парламенцкай асамблеі АБСЕ па палітычных пытаннях і бяспецы ў рамках 29-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ ў фармаце відэа-канферэнц-сувязі.**

— Мы разгледзім даклад аб сітуацыі ў рэгіёне АБСЕ ў розных краінах. Прааналізуем палітычны парадак дня, а таксама сітуацыю ў асобных краінах і тэрыторыях. Плануецца абмеркаваць рознабаковы падыход і ролю парламенцкіх структур ва ўмацаванні атмасферы даверу і ўзаемнага супрацоўніцтва. Я збіраюся ўзняць важнае пытанне: чаму сёння механізмы прадстаўнічай дэмакратыі, якая добра сябе зарэкамендавала ва ўсім свеце, падмяняюцца на інструменты прамой і, я б сказаў, вулічнай дэмакратыі? Чаму неарганізаванаму натоўпу, які кіруецца невядома кім, даецца права гаварыць ад імя народа і дэзарганізоўваць сітуацыю ва ўласных краінах? Яшчэ нейкі час таму мы меркавалі, што каляровыя рэвалюцыі могуць праходзіць толькі ў краінах з неакрэплымі палітычнымі інстытутамі і дзяржаўнымі традыцыямі, але сітуацыя ў ЗША паказвае, што гэта далёка не так. Гэты хаос можа адбыцца ў любой краіне. Мы павінны абмеркаваць, што могуць зрабіць парламентарыі, каб не дапусціць пагаршэння сітуацыі і тым больш не дапусціць новых раздзяляльных ліній у Еўропе, — сказаў дэпутат перад пачаткам пасяджэння.

Трэба адзначыць, што Андрэй Савіных планаваў выезд у Вену для ўдзелу ў сесіі, аднак атрымаў адмову ў візе.

— Я мусіў прадставіць пазіцыю Беларусі па актуальных пытаннях парадку дня, у тым ліку і па сітуацыі ў краіне. Але мы атрымалі інфармацыю, што ў візе мне адмоўлена. Прычым у самім дакуменце паведамілі наступнае: у шэнгенскую інфармацыйную сістэму ўнесены запіс Рэспублікі Польшча з мэтай адмовы ў выездзе. І прыведзены даныя аб прычынах такой адмовы.

Андрэй Савіных выказаў меркаванне, чаму менавіта Польшча ўнесла яго ў лік персон нон грата.

— Пры абмеркаванні сітуацыі ў Беларусі мы плануем узнімаць пытанні аб уцягнутасці спецслужбаў шэрагу краін, у тым ліку Польшчы, у аперацыі па перахопе ўлады ў Беларусі праз сцэнарый каляровых рэвалюцый. Лічу, што абмеркаванне гэтых пытанняў на ўзроўні міжпарламенцкіх структур ужо ставіць Польшчу ў дастаткова непрыемнае становішча. Магчымыя і іншыя згадкі, але ў любым выпадку яны выстаўляюць Польшчу ў яшчэ больш складаным непрыемным святле. Мы можам канстатаваць адно: любыя дакументы і пытанні, якія могуць быць разгледжаны па тэме Беларусі, дыскрэдытаваны, бо для ўдзелу нашых дэлегацый не створаны належныя ўмовы.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

Адным шляхам

# БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКІ ФОРУМ ПРОЙДЗЕ Ў «ВЯЛІКІМ КАМЕНІ»

**Абмяркуюць розныя кірункі пліннага супрацоўніцтва**

**У індустрыяльным парку «Вялікі камень» абмяркуюць узаемадзеянне Беларусі і Паднябеснай. Тут адбудзецца беларуска-кітайскі форум дзелавога, навуковага, медыйнага і культурнага супрацоўніцтва, паведаміў «Звяздзе» старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЕЕЎ.**

Шматлікія эксперты (запланавана выступленне паўтара дзясятка спікераў з розных галін) прааналізуюць вынікі і перспектывы двухбаковых адносін. Фармат мерапрыемства і месца яго правядзення (нездарма «Вялікі камень» называюць адным са знакавых участкаў транснацыянальнага праекта «Адзін пояс, адзін шлях») прадугледжваюць насамрэч рэальныя высновы для актывізацыі супрацоўніцтва.

Унікальнасць мерапрыемства яшчэ і ў тым, што на пляцоўцы парка ў рэжыме відэаканферэнцыі адбудзецца таксама глабальны саміт КПК і палітычных партый свету (з нагоды 100-годдзя Кампартыі Кітая). Так што на Пекінскім праспекце (дзе размешчана адміністрацыя «Вялікага каменя») будзе цікава.

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Памёр Уладзімір Мяньшоў



**Савецкі і расійскі рэжысёр і кінаакцёр Уладзімір Мяньшоў памёр на 82-м годзе жыцця ад наступстваў каранавіруснай інфекцыі, паведамляецца на сайце кінаканцэрна «Масфільм».**

«Мы страцілі нашага дарагога сябра, «масфільмаўца», які аддаў родны кінастудыі ўсе свае творчыя сілы і яркі талент, па-сапраўднаму народнага рэжысёра, цудоўныя фільмы якога ведаюць і любяць мільёны людзей», — адзначаецца ў паведамленні. Пра тое, што рэжысёр заразіўся інфекцыяй, стала вядома 26 чэрвеня. Пры гэтым удакладнялася, што хвароба працякае ў лёгкай форме.

Як паведамілі на «Масфільме», пра дату і час развітання з рэжысёрам стане вядома пазней.

Мяньшоў нарадзіўся ў Баку, скончыў школу-студыю МХАТ і аспірантуру пры кафедры рэжысуры ў ВДІКу. У якім кіно ў якасці акцёра заявіў пра сябе ў 1972 годзе ў драме Аляксея Сахарава «Чалавек на сваім месцы». Усяго на яго рахунку каля 120 роляў. Рэжысёрскі дэбют адбыўся ў 1976-м музычным фільмам «Розыгрыш» па сцэнарыі Сямёна Лунгіна. Потым былі «Масква слязам не верыць», якая ў 1981 годзе атрымала «Оскар», а таксама «Каханне і галубы», «Шырлі-мырлі» і іншыя.

## Пасля бою з талібамі ў Таджыкістан адступіла больш за 1000 афганскіх вайскоўцаў

**Таджыкскія пагранічнікі ўпусцілі на тэрыторыю сваёй краіны больш за 1000 ваеннаслужачых з Афганістана, якія адступілі пасля сутыкнення з баевікамі руху «Талібан». Пра гэта паведамляе агенцтва «Хавар» са спасылкай на пагранслужбы Таджыкістана.**

«Сітуацыя абумоўлена вывадам з Афганістана войскаў НАТА і наступленнем «Талібана» на ўрадавыя войскі. Групоўка ўжо кантралюе 40 % краіны. У ходзе ўзброеных сутыкненняў з талібамі 1037 афганскіх вайскоўцаў адступілі, каб выратаваць свае жыцці, перайшоўшы граніцу», — сказана ў паведамленні.

Пагранслужба дадала, што ваеннаслужачых з Афганістана пусцілі на тэрыторыю Таджыкістана, улічваючы добрасуседскія адносіны і неўмяшанне ва ўнутраныя справы краіны. Тэрарыстычны рух «Талібан» распачаў маштабнае наступленне на ўрадавыя сілы пасля таго, як 1 мая краіны НАТА на чале з ЗША пачалі вывад з краіны сваіх ваенных.

Зараз групоўка кантралюе больш тэрыторыі, чым калінебудзь за апошнія 20 гадоў, — каля 40 % краіны. У адказ на прасоўванне «Талібана» ўрад Афганістана аб'явіў нацыянальную мабілізацыю і пачаў раздаваць добраахвотнікам зброю.

## Жанчына знайшла на гарышчы Дэкларацыю незалежнасці ЗША і стала мільянеркай



**Жыхарка шатландскага горада Эдынбурга знайшла на гарышчы свайго дома копію Дэкларацыі незалежнасці ЗША і стала мільянеркай. Пра гэта паведамляе BBC News.**

Дакумент выявіла спецыяліст па рэдкіх кнігах Кэці Марсдэн, калі разбірала завалы ў сябе на гарышчы. «Я разбірала стос папер і заўважыла складзены пергамент», — расказала жанчына. Яна адразу ж адвезла паперчыну на экспертызу, дзе пасля працяглых даследаванняў яе сапраўднасць была пацверджана. Знойдзеная Дэкларацыя незалежнасці аказалася адным з 201 адбітка, зробленага капіравальшчыкам Уільямам Стоўнам па замове Сената ЗША ў 1820-х гадах. На дадзены момант вядомае месцазнаходжанне 48 дакументаў з гэтай серыі.

Як удалося ўстанавіць Марсдэн, яе знаходка была адным з двух экзэмпляраў, якія належалі Чарльзу Кэралу — аднаму з палітычных дзеячаў, якія падпісалі Дэкларацыю аб незалежнасці ЗША 4 ліпеня 1776 года.

1 ліпеня дакумент быў прададзены на аўкцыёне ў ЗША за 4 мільёны 420 тысяч долараў.

Кампетэнтна

# «Інфармацыйная вайна ўжо ідзе»

**Аб гэтым на ўрачыстым сходзе з нагоды 100-годдзя «Белорусской военной газеты. Во славу Родины» заявіў міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

— Супраць нас разгорнуты «гарматы», а таксама іншыя прылады, больш каварныя і сучасныя, скіраваныя не на нашы целы, а на наш розум і, самае галоўнае, на сэрцы маладога пакалення, — адзначыў міністр інфармацыі. — У гэты перыяд на нас з вамі ўскладаецца вельмі адказная задача па выхаванні і перавыхаванні моладзі, якая прыходзіць у шэрагі Узброеных Сіл. Прыходзіць ужо са сваім сфарміраваным пад уплывам сацыяльных сетак светапоглядам, мае сваё дастаткова перакручанае разуменне любові да Радзімы і дастаткова невыразнае ўяўленне аб гісторыі нашых перамог і таго, што мы — нашчадкі народа-пераможцы.

Нагадаем, цэнтральны друкаваны орган Міністэрства абароны днямі адзначыў стагадовы юбілей. Першы нумар «Красноармейской правды» (першапачаткова газета называлася менавіта так) быў надрукаваны 22 чэрвеня 1921 года ў Смаленску. Як і «Звязда», у гады Вялікай Айчыннай вайны «Белорусская военная газета. Во славу Родины» не спыняла свайго выхаду. Сёння гэта сучаснае выданне аб беларускай арміі.

— Газета з'яўляецца канкурэнтаздольнай, мультымедыйнай, яе матэрыялы нязменна выклікаюць шчырую цікавасць і жывы водгук не толькі ў ваенных спецыялістаў, а і ў шырокай грамадскасці як у нашай краіне, так і за мяжой, — адзначыў, віншуючы супрацоўнікаў выдання, **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.** — «Белорусская военная газета. Во славу Родины» па-ранейшаму верная свайму галоўнаму прызначэнню — даваць вычарпальную і дакладную інфармацыю па пытаннях ваеннай бяспекі дзяржавы, а таксама дастойна паказваць вобраз сучаснай беларускай арміі шырокаму чытачу.

**Вераніка КАНЮТА.**

Стыхія

# НОВЫ МОСТ У ГРОДНЕ АДНОВЯЦЬ ЗА 7—10 ДЗЁН

## Пра гэта заявіў Уладзімір Каранік падчас агляду наступстваў нядзельнага ліўня

**Моцны дождж стаў сапраўдным выпрабаваннем для дарожнай інфраструктуры Гродзенскага рэгіёна. Разгул стыхіі закрануў як горад, так і наваколле. Пад вадой аказаліся цэлыя вуліцы, многія дарогі нагадвалі каналы. Некаторыя аўтамабілі былі вымушаныя спыняцца з-за таго, што не змаглі «фарсіраваць» моцныя патокі вады. Здараліся выпадкі эвакуацыі аўтамабіля з воднага палону.**

У мікрараёне Зарыца новая дарога нагадвала горную рэчку з невялікімі парогамі. Размыла дарогу і каля вёскі Жылічы, там з'явіліся даволі вялікія вымоіны. Патокі вады сталі прычынай апоўзняў. Змыла грунт у парку імя Жылібера і каля цэнтральнага рынку.

Але самыя сур'ёзныя наступствы залевы закранулі новы аўтамабільны мост, будаўніцтва якога амаль завершана. Пад уздзеяннем воднага патоку частка дарожнага палатна абвалілася, былі размыты і адхоны, якія ўмацоўваюць збудаванне. У яму ўпаў фанарны слуп, частка асфальту і пешаходнай дарожкі. Абвал здарыўся а шостай гадзіне вечара. Месца адразу было агароджана блокамі.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік у панядзелак выехаў на месца здарэння. У ліку прычын разбурэння дарожнага палатна кіраўнік рэгіёна назваў адсутнасць умацавання адхонаў травой і дзёрнам, а таксама выхад са строю ліўнеўкі. У выніку вада стала пастурапаць як з самога дарожнага палатна, так і з каналізацыі, што і выклікала такі маштаб пашкоджання.

— Сітуацыю ацанілі, — падкрэсліў Уладзімір Каранік у каментарыі журналістам. — Мост яшчэ не ўведзены ў эксплуатацыю, паколькі вялася яго праверка, у тым ліку ліўневай каналізацыі. Вядома, не хацелася б, каб яна правяралася такім экстрэмальным спосабам. Зараз будзе праведзена ўмацаванне грунту. Будзем улічваць той факт, што тут самая нізкая кропка дарогі, што садзейнічае назапашванню вады. Таму будуць арганізаваны латкі для аварыйнага ветвы скіду. Схілы будуць умацаваныя геасеткай, якая супрацьстаіць ліўням. Лічу, што ўсе гэтыя мерапрыемствы, якія разлічаны на 7—10 дзён, дазволяць не толькі ліквідаваць пашкоджанні, але і звесці да нуля рызыку паўтарэння сітуацыі.

Уладзімір Каранік паведаміў, што ў горадзе зараз распрацоўваецца план ліквідацыі наступстваў воднай стыхіі. У ліку мерапрыемстваў — прамыўка ліўнеўкі, дадатковыя вадаскіды, замена дарожнага палатна.

Напружанымі сталі мінулыя суткі і для службы МНС Гродзенскай вобласці. Амаль 30 разоў яны выязджалі на выклікі, звязаныя з навальніцай. Як паведамілі ў абласным упраўленні, асноўная дапамога аказвалася па пампаванні вады на падворках Гродна і раёна, якія аказаліся пад вадой. Вяліся работы па зніжэнні рызыкі падтаплення. Напрыклад, у вёсцы Капцёўка былі адчынены шлюзы і зніжаны ўзровень вады ў вадасховішчы, загароджаны месцы абвальванняў, у прыватнасці ўчастак дарогі на ўездзе ў вёску Жылічы Гродзенскага раёна.



Фота БЕЛТА.

Таксама ратавальнікі правялі распілоўку паваленых дрэў. Адно з іх упала на жылы дом у Навагрудку, другое — на дарогу ў Гродзенскім раёне. Ніхто з жыхароў не пацярпеў. Між тым ратавальнікі папярэджваюць, што дажджліваe надвор'е захаваецца ў рэгіёне і на найбліжэйшыя дні.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

На слыху

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — БЯСПЕКА

## Ахова беларуска-ўкраінскай граніцы ажыццяўляецца ва ўзмоцненым рэжыме

**У першую чаргу размова ідзе аб узмоцненым варыянце нясення пагранічнай службы і пагранічнага кантролю. На ўкраінскім кірунку павялічана колькасць пагранічных нарад як на зялёнай граніцы, так і ў пунктах пропуску.**

— З улікам абстаноўкі, якая складваецца, на асобных участках дзяржаўнай граніцы органы пагранічнай службы прымяняюць тактычныя рэзервы для больш жорсткага кантролю за парадкам наведвання і прабывання грамадзян у пагранічнай зоне і паласе, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.** — Афармленне асоб, якія перасякаюць граніцу ў пунктах пропуску, ажыццяўляецца як на ўезд, так і на выезд з улікам дзеючых абмежаванняў і дадатковых мер бяспекі, якія заключаюцца ва ўзмацненні кантролю асоб і дагляду транспартных сродкаў — перш за ўсё тых, якія ўязджаюць у Беларусь.

Як падкрэслілі ў Дзяржпагранкамітэце, беларуская пагранічная служба мае дастаткова сіл і сродкаў для забеспячэння нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь на дзяржаўнай граніцы.

А тым часам прапускны рэжым праз пагранічныя пераходы беларуска-ўкраінскай граніцы на тэрыторыі Гомельскай вобласці ажыццяўляецца ў ранейшым рэжыме. Паводле інфармацыі аператыўнага дзяжурнага Гомельскай пагранічнай групы, перасячэнне беларуска-ўкраінскай граніцы рэгулюецца згодна з пастановай № 624 «Аб мерах па прадухіленні распаўсюджвання інфекцыйнага захворвання» Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 2020 года. Так, для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства часова прыпынена перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь праз аўтадарожныя пункты пропуску, пункты спрошчанага пропуску, пункты пропуску на чыгуначных вакзалах і ў рачных партах. Абмежаванні не распаўсюджваюцца на шэраг катэгорый грамадзян. Сярод іх — замежныя грамадзяне, якія едуць па дыпламатычных і службовых пашпартах, кіраўнікі і члены афіцыйных дэлегацый, кіроўцы транспартных сродкаў пры выкананні міжнародных аўтамабільных перавозак і перавозак міжнародных паштовых адпраўленняў, замежныя грамадзяне з ліку мужа, жонкі, бацькоў або дзяцей беларусаў. Не датычацца абмежаванні перасячэння граніцы для грамадзян, якія едуць у нашу краіну па паведамленні аб цяжкай хваробе або смерці блізкіх родных.

Між тым інтэрнэт-рэсурс Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь звяртае ўвагу, што шэраг сумежных пунктаў пропуску ва ўмовах COVID-19 не функцыянуе. Гэта датычыцца і пунктаў пропуску беларуска-ўкраінскай граніцы. Так, не працуюць пагранічныя пункты пропуску Тамашоўка, Алтуш, Невель, Верхні Церабяжоў, Глушкевічы. Функцыянуюць пункты пропуску Макраны, Махро, Новая Рудня, Аляксандраўка, Камарын, Новая Гута, Вясялоўка.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Надвор'е

# Сонечна і без дажджоў

## Цяпер ужо ліпень прыпякае нас — на праве гарачага месяца

**Амаль увесь тыдзень нас чакае пераменная воблачнасць, будзе без істотных ападкаў: у гэты час мы будзем пад уздзеяннем антыцыклону, цэнтр якога будзе размяшчацца над цэнтральнымі раёнамі Еўрапейскай Расіі. А гэта значыць, што да нас вяртаецца трапічная спякота, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**





У такіх умовах слупкі тэрмометраў з кожным днём будуць падымацца ўсё вышэй, забяспечваючы павышэнне тэмпературы з плюс 24—29 градусаў у пачатку тыдня да 28—33 цяпла — ужо ў нядзелю.

Калі сёння ў другой палове дня чакаюцца яшчэ дажджы і навальніцы, то ў сераду будзе без ападкаў, пераменная воблачнасць. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—19 градусаў вышэй за нуль, удзень будзе ад плюс 26 градусаў да 32 цяпла.

Пераменная воблачнасць чакае нас і ў чацвер. Будзе пераважна без ападкаў. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні, паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 цяпла, удзень — ад плюс 27 градусаў да 33 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, потым, на працягу трох дзён (пятніца — нядзеля), нас чакае неймаверная спякота. Уначы будзе душна, калі бетонныя каробкі будуць не паспяваць астываць — на адкрытым паветры плюс 14—20 цяпла, аднак у кватэрах, якія без кандыцыянераў, значна больш. А ўдзень сонца будзе старацца нас расплавіць, калі, пачынаючы з 10—11 раніцы і аж да вечара, будзе трымацца максімальная тэмпература 28—33 градусаў спякоты. Што будзе ў наступны панядзелак, пакуль не паведамляюць. Спадзяёмся, што менш...

**Сяргей КУРКАЧ.**

Альтэрнатыўная энергетыка

# ДЫВІДЭНДЫ З ПАВЕТРА

## 10 гадоў таму ў Беларусі запрацаваў першы прамысловы вятрак магутнасцю 1,5 МВт

**А праз пяць гадоў пушчана ў дзеянне цэлая ветраэлектрастанцыя. Гэта стала пачаткам развіцця ў краіне новага віду альтэрнатыўнай энергетыкі. Між тым, стварэнне ветрапарка аказалася справай не аднаго года. Мантаж установак праходзіў у складаных умовах надвор'я. Але энергетыкі настроены на працяг праекта, што дазваляе і падстанцыя: яе ёмістасць яшчэ трымае свабоднымі каля 10 МВт. Цяпер доля аднаўляльных крыніц энергіі ў краіне складае 8 %.**



Фота РУП «Гроднаэнерга».

Пры пад'ездзе да Навагрудка нельга не звярнуць увагу на магутныя ветракі. Тых, што ўваходзяць у сістэму «Гроднаэнерга», цяпер шэсць. Яны выглядаюць велічна — вышыня аднаго такога гіганта большая за 80 метраў, а даўжыня адной лопасці — 42 метры. Ветракі стаяць на Навагрудскім узвышшы, на Пуцэвіцкай гары, таму добра бачныя з трасы.

Ідэя стартавала роўна 10 гадоў таму. Але перш чым прыступіць да рэалізацыі праекта, спецыялісты прадпрыемства «Гроднаэнерга» вывучалі мясцовасць, лагістыку і саму работу ветрака. Пабывалі на некалькіх заводах Кітая, дзе наладжаны выпуск ветрагенератараў. Была здзейснена паездка на востраў у Жоўтым моры, каб паназіраць за работай мясцовага ветрапарка. І толькі пасля дасканалага вывучэння эфектыўнасці ветракоў на тэрыторыі Беларусі было прынята рашэнне аб іх установцы.

Падрыхтоўчы этап аказаўся даволі працаёмкі. Каб надаць трываласць фундаменту, заліўка бетону вялася няспынным метадам. Работы занялі тры месяцы. У выніку быў падрыхтаваны фундамент дыяметрам 14 метраў і масай адна тысяча тон. Ветраўсталёўку даставілі з Кітая — спачатку марскім шляхам да нямецкага Гамбурга, а затым на спецыяльных платформах аўтацягніком у Беларусь. У красавіку 2011 года першы вятрак быў уключаны ў энергасістэму Гродзенскай вобласці. Яго магутнасць склала 1,5 МВт, што ўдвая больш, чым у ветракоў на кітайскім востраве.

— Вядома, была нейкая доля рызыкі, — прызнаецца **генеральны дырэктар РУП «Гроднаэнерга» Віктар ЖУК.** — Напрыклад, былі сумненні, наколькі праект эфектыўны ў дзеянні. Ёсць такое паняцце, як каэфіцыент выкарыстання магутнасці. І калі ён вышэйшы за 20—25 %, праект лічыцца эфектыўным. Гэты каэфіцыент паказала наша ветраэнергетычная ўстаноўка.

Пасля паспяховага «пробнага шара» было вырашана рэалізаваць больш маштабны праект. А канкрэтна — стварыць ветрапарк. Выбар пляцоўкі ўзгоднены з распараджэннем Прэзідэнта ў ліпені 2013 года. Праз два гады, у лістападзе, пачаўся мантаж яшчэ пяці ветракоў.

Удзельнікі тых падзей успамінаюць, што работы вяліся ў марознае надвор'е, хуткасць ветру дасягала 10-15 метраў у секунду. Прыходзілася чакаць, пакуль вецер не сціхаў. Такім чынам мантаж адной установкі доўжыўся некалькіх тыдняў. Некаторыя ветракі ўстанаўлівалі ў тумане, калі з зямлі сувязь была толькі па рацыі. Ветрапарк быў уведзены ў эксплуатацыю летам 2016 года, яго магутнасць разам з першым ветрагенератарам склала 9 МВт. Ужо праз год станцыя пацвердзіла сваю эфектыўнасць.

— З улікам інвестыцый быў зроблены разлік параметраў, на якія павінна выйсці станцыя пасля года з моманту пуску. Яны пацвердзіліся. Былі выпрацаваны 22 мілёны кілаватгадзін электраэнэргіі. Гэта пацвердзіла эфектыўнасць ветраэнергетычнага праекта пад Навагрудкам, — адзначыў Віктар Жук.

Як паказаў маніторынг, хуткасць ветру тут спрыяльная для работы ветраўсталёвак. У Навагрудку за мінулы год сярэдні паказчык склаў больш за 6 м/сек. А лопасці пачынаюць круціцца пры сіле ветру ў 3 м/сек. Цікава, што сістэмы запраграмаваны такім чынам, каб знаходзіць напрамак ветру і паварочвацца за ім. З кола лопасці энергія кручэння перадаецца праз рэдуктар на генератар, які і выпрацоўвае электрычны ток.

Самая спрыяльная пара для работы ветракоў — восень і зіма. Праўда, назіраліся даволі моцныя парывы. Была зафіксавана максімальная хуткасць у 33 м/сек, пры такім ветры генератар аўтаматычна спыняецца, каб зменшыць нагрузку на фундамент і вежу ветраўсталёўкі.

Усяго за 10 гадоў у энергасетку вобласці паступіла больш за 130 мільёнаў кілаватгадзін. Ветраэлектрычная станцыя дазваляе замяніць аб'ём прыроднага газу больш чым на два мільёны «кубоў» на год. А праграма «Энергазберажэнне» на 2021—2025 гады якраз і прадугледжвае паступовае зніжэнне спажывання прыроднага газу. Такія альтэрнатыўныя праекты ў будучым могуць паўплываць і на тарыфы электраэнергіі.

— Сабекошт энергіі складваецца з затрат на яе вытворчасць, перадачу і размеркаванне. Ад гэтага залежыць і тарыф, які атрымае спажывец. Калі б ветрастанцыя займала ў структуры электраэнергетыкі краіны 90 % — гэта адзін эфект, а калі некалькі працэнтаў — эфект, адпаведна, іншы, — патлумачыў Віктар Жук. — Між тым, праект дазваляе зразумець, наколькі альтэрнатыўныя крыніцы энергіі эфектыўныя і наколькі істотную даюць магчымасць знізіць сабекошт кілаватгадзіны.

**Маргрыта УШКЕВІЧ.**

Ініцыятыва

# «КВАТЭРЫ» ДЛЯ БУСЛОЎ

**У аграгарадку Мілавіды Баранавіцкага раёна з'явіліся першыя абсталяваныя «кватэры» для буслоў, на якія ёсць тэхнічная дакументацыя. Шматгадовыя назіранні паказалі, што буслы ўсё больш актыўна перабіраюцца на лініі электраперадачы. Яно і зразумела, на дрэве птушкі звіць гняздо не могуць, гэтак жа як і на сучасных дамах, старых саламяных (ці з дранкі) дахаў ужо не засталося. А калі няма альтэрнатывы, сваё жытло буслы ладкуюць на слупах ЛЭП. Там, дзе правады неізаляваныя, птушкі нярэдка гінуць ад удару токам. Людзі часова застаюцца без электрычнасці ў выніку аварый, звязаных з буслами. Але сёння распрацаваны адмысловыя апоры для ЛЭП з платформай для гнёздаў белых буслоў.**



### Птушыная вёска

Раней у Мілавідах было каля трыццаці бусліных гнёздаў. Прычым для мясцовых жыхароў да гэтага часу застаецца загадкай, чаму птушкі так аблюбавалі менавіта іх вёску, а ў іншых населеных пунктах, дзе, здавалася б, таксама ёсць вада і кармавая база, не селяцца...

У 2019 годзе ў «буслінай вёсцы» энергетыкі скінулі каля дзесяці гнёздаў са слупоў ЛЭП.

«Прылятаюць птушкі на старыя гнёзды, а іх няма, пакуль стараюцца пабудаваць новыя, час страчаны, позна выседжваць яйкі. У нас раней верылі, што да Благавешчання (7 красавіка) павінна быць першае яйка ў бусла. І калі раней у буслянках было па 3-4 птушаняці, то цяпер іх паменела. Птушкі скідвалі «лішніх» буслянят», — згадвае **старшыня Мілавідскага сельвыканкама Наталля ДАВІДОВІЧ.**

«Гэта была сапраўдная трагедыя», — далучаецца да размовы Марыя Саладуха, якая ўжо каля 16 гадоў з'яўляецца старастай у Мілавідах. У яе з буслами асаблівая сувязь. 23 гады таму яе сям'я выгадавала малое бусляня, якое падабралі дзеці. «Прынеслі на кухню, паставілі місачку з вадой, а я ў іх пытаюся: «Вы што, казку «Ліса і журавель» не чыталі?» Паставілі тады яму вядро. Кармілі мясам, блінамі з маслам, яйкі вараныя давалі, мужыкі рыбу лавілі. Я насіла яго на возера, каб вучыўся жаб лавіць, — успамінае Марыя Аляксееўна. — Як з работы прыду, клічу: «Шурка!» Ён і ляціць да мяне. Прытулю да сябе, а ён як стане дзюбай ляскаць... Неяк па вуліцы жанчына ішла, у якой дзяцей доўга не было, вось і кажу сваім малым, каб ёй далі з буслікам паняньчыцца. І хутка яна нарадзіла дзіця. А мне як акушэрцы па прафесіі дужа гэта цікава было». У той год гадаванец паляцеў з іншымі буслами. А ўвесну вярнуўся, хадзіў, аглядаў знаёмы двор... Вядома, што буслы жывуць да 39 гадоў, і хто ведае, можа, сярод пакрыўджаных і абяздоленых буслоў, чые гнёзды былі скінуты ў Мілавідах, мог быць і той Шурка?

Менавіта Марыя Саладуха разам з актывістам з вёскі Кулікі першыя ўзняліся на абарону буслоў.

### Выйсце ёсць

Вясна два гады таму выдалася халодная, людзі назіралі за адчайнымі спробамі птушак скласці гнёзды наноў ці за самотнымі буслами, якія хадзілі па палях і не ведалі, дзе прытуліцца. Мясцовыя актывісты пачалі грукаца ва ўсе дзверы, слаць лісты ў розныя інстанцыі. У тым ліку звярнуліся і ў Адміністрацыю Прэзідэнта, і менавіта адтуль паступіла даручэнне аб неабходнасці вырашэння «буслінага пытання».

Па заказе ДВА «Белэнерга» ААТ «Белсельэлектрасетбуд» былі распрацаваны канструкцыя і дакументы на слупы ЛЭП з бяспечнымі платформамі для буслоў. Сама ідэя не новая: штучныя платформы ёсць у Польшчы, Славакіі, Грэцыі, Тунісе, Азербайджане і іншых краінах. Але нідзе ў свеце няма афіцыйнай тэхнічнай дакументацыі на іх.

Як расказаў **кіраўнік грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ**, праблему з птушыным кватараваннем на Беларусі ўздымалі і раней. Тым больш што энергетыкі не проста скідвалі гнёзды, але і прывярвалі на слупы арматурыны (так званыя яршы), каб птушкі не змаглі рабіць гнёзды. Калі ж буслы спрабавалі ладкавацца на такіх месцах, калечылі крылы.

Навінка бясспрэчна будзе спрыяць ахове птушак, бо раней наогул было невядома, што рабіць з буслами на ЛЭП. Пасля таго як у мінулым годзе былі распрацаваны стандарты, энергетыкі атрымалі правa пераносіць гнёзды на платформу. Усё ж іх на кожную апору не паставіш, сама канструкцыя важыць нямала, а разам з гняздом можа «важыць» 400 кілаграмаў. Да таго ж трэба зрабіць так, каб такія бусліныя хаты былі даволі трывалыя.

Часам людзі просяць энергетыкаў пры замене слупоў пакідаць старыя апоры з гнёздамі. Але праз некаторы час апора можа паваліцца, і не дай бог на галовы людзей. І хто будзе несці за гэта адказнасць? Тым больш што на дэманціраваныя слупы падпісваюцца дакументы.

Сёння ўжо ніхто проста так не зможа скінуць гняздо, і, як заўважыў **намеснік начальніка Баранавіцкай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Анатоль ПЛЕШКА**, самавольнае знішчэнне буслянкі «пацягне» на 30 базавых.

### Што далей?

Па апошнім падліку, які рабіўся ў 2015 годзе, на Беларусі налічылі 22,5 тысячы бусліных пар. Гэта 10 працэнтаў ад папуляцыі ў свеце. Натуральна, перасяліць такую птушыную армію на бяспечныя платформы будзе не так проста. І найперш важна падумаць, за чый кошт будуць ствараца бусліныя «кватэры».

У Мілавідах пакуль устанавілі чатыры пробныя платформы, прычым для адной з іх спецыяльна абралі месца пры дарозе, каб прапагандаваць карысны вопыт. Дарэчы, птушкі адразу перабраліся ў афіцыйныя кватэры, бо на металічныя асновы людзі паклалі старыя гнёзды.

Канструкцыя, распрацаваная ў 2020 годзе, каштуе каля 500 рублёў, за яе ўстаноўку трэба аддаць яшчэ каля тысячы. Такім чынам, адна птушыная «кватэра» абыходзіцца ў паўтары тысячы, але расходы на яе нідзе не прапісаны. Як заўважыла Наталля Давідовіч, сёлета на добраўпарадкаванне Мілавідскага сельскага Савета выдзелена дзве тысячы рублёў (а гэта і касьба, замена плота, іншыя работы). І яна мяркуе, што да перасялення буслоў можна было б падключаць прыватнікаў і розныя арганізацыі, і калі знойдуцца ахвотныя ўкласціся грашыма і працай (напрыклад, зварыць платформу), сельсавет гатовы ўсё арганізаваць.

Магчыма, выдаткі на буслоў павінны адразу ж закладвацца ў праект, калі планава мяняюцца лініі электраперадачы, тым больш што распрацаваны стандарты на платформы ўжо дазваляюць гэта зрабіць.

**Кіраўнік філіяла «Баранавіцкія электрычныя сеткі» РУП «Брэстэнерга» Андрэй ГЕЦЭВІЧ** звярнуў увагу, што платформы ставяцца не толькі для таго, каб зберагчы птушак ад сутыкнення з правадамі, але і забяспечыць бесперабойнае электразабеспячэнне, бо бывала, што гнёзды загараліся.

Штогод бусел, калі абнаўляе сваё гняздо, павялічвае яго на 80 кілаграмаў. Буслянка разрастаецца і ўверх, і ўзніз, «абдымае» правады. Да таго ж зробленая птушкай у неабсталяваным месцы буслянка, калі дасягае вагі ў 5-6 цэнтнераў, можа абрываць правады, таксама іх можа разʼядаць птушыны памёт. А цяпер увіце, што гняздо можа прырастаць на 2-3 паверхі, а бусел будзе шчыраваць над ім, пакуль тое не зваліцца. Таму важна падумаць і пра тэхнічнае абслугоўванне птушыных «кватэр», хоць бы раз на 4-5 гадоў скідваць верхнюю частку гнязда (так арнітолагі робяць з гнёздамі дзікіх птушак, каб тыя незнарок не абваліліся разам з яйкамі ці птушанятамі).

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Хто і што складае «Залатое кола беларускай навукі»

**У цэнтры Мінска, у скверы паміж Нацыянальнай акадэміяй навук і Цэнтральнай навуковай бібліятэкай навук імя Якуба Коласа, гэтымі днямі з'явіўся помнік Францыску Скарыне, пяты па ліку ў сталіцы. Ён з'яўляецца часткай архітэктурна-мастацкай кампазіцыі «Залатое кола беларускай навукі» ў праекце «Алеі славы беларускай навукі».**



Па прапанове Прэзідыума НАН распрацоўкай праекта займалася архітэктурна-інавацыйнае бюро БНТУ. Ім кіруе **Армэн Сяргеевіч САРДАРАЎ, дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ.** Архітэктурна-інавацыйнае бюро займаецца выкананнем навукова-даследчых праектаў, навуковым кіраўніцтвам на аб'ектах гісторыка-культурнай каштоўнасці. У прыватнасці, спецыялістамі бюро распрацаваны праект сквера ў Нясвіжы, праект устаноўкі металічнай копіі самалёта «Іл-2» у музейнай экспазіцыі мемарыяльнага комплексу «Курган Славы», помнік Антонію Тызенгаўзу ў Паставах і шмат чаго іншага.

— Спачатку Акадэмія навук замовіла ў нас праект па добраўпарадкаванні скверу, але не толькі для таго, каб можна было там адпачыць, абмеркаваць нешта на свежым паветры. Вядома, трэба было надаць гэтай рабоце нейкае грамадскае значэнне, і таму было вырашана зрабіць там алею выдатных айчынных вучоных. Назву «Залатое кола беларускай навукі» прапанаваў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Гусакоў, — падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» Армен Сардараў. — Так нарадзілася ідэя ратонды з помнікамі беларускіх грамадскіх дзеячаў, якія заклалі падмурак беларускай навукі.







Будаванне ратонды пачалося ў 2020 годзе. Гэтая ратонда быццам дапаўняе архітэктуру самой Акадэміі навук, стылізавана пад знешні выгляд галоўнага будынка. Яе калоны зроблены з шэрага граніту.

У «Залатым коле беларускай навукі» запланавана паставіць помнікі (акрамя ўжо гатовага Францыску Скарыне) Кірылу Тураўскаму, Сімяону Полацкаму, Яўхіму Карскаму, Усеваладу Ігнатоўскаму, Яўстафію Тышкевічу і Казіміру Семяновічу. Па словах Армена Сардарава, работу разлічваюць скончыць гэтым летам. Каля кожнага помніка ўжо зроблены картушы, на якіх знаходзяцца знакамітыя выказванні гэтых навуковых дзеячаў. Побач з Францыскам Скарынам на картушы напісана: «Слова вучыць, выкрывае, выпраўляе і паказвае шлях да праўды!»

Каб зрабіць гэтыя помнікі, запрасілі скульптараў Алену і Аляксея Хараберушаў.

Таксама Армэн Сяргеевіч падзяліўся з газетай «Звязда» меркаванымі планамі НАН на адкрыццё кампазіцыі:

— У цэнтры ратонды стаіць вертыкальная стэла, на якой зроблена капсула часу ў выглядзе зямнога шара. У гэтую капсулу часу павінна быць закладзена пасланне нашчадкам ад беларускіх вучоных нашага часу.

Цікава і тое, што гэта ўжо пяты помнік Францыску Скарыне ў сталіцы. Адзін з помнікаў знаходзіцца ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, другі зрабілі каля Нацыянальнай бібліятэкі, трэці помнік, прысвечаны асветніку, — «Веды — моц», чацвёрты, каменны, стаіць у парку Янкі Купалы.

**Наталля ДРАЗДОВА.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Справы духоўныя

# ВІЦЕБСК УЗГАДАЎ КНЯЗЯ АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА

**У Віцебску маштабна адсвяткавалі 800-ю гадавіну з дня нараджэння святога дабравернага вялікага князя Аляксандра Неўскага. Падзеі зацікавілі нават атэістаў. У абласным цэнтры ёсць помнік, на якім увекавечаны князь разам з жонкай — віцебскай княжной Аляксандрай і сынам Васілём. Такім чынам, гэты легендарны чалавек для віцяблян, як той казаў, не чужы. Упершыню ў сталіцу Падзвіння — у першы з беларускіх гарадоў — прывезлі мошчы, што стала вялікай падзеяй для вернікаў. У той жа дзень заклалі камень ніжняга храма ў гонар Аляксандра Неўскага ў будучым Сафійскім саборы, які пабудуюць на беразе Заходняй Дзвіны.**





Фота аўтара.

Каўчэг з самай вялікай часціцай святых мошчаў князя прывезлі ў Віцебск са Смаленска 2 ліпеня, у той жа дзень іх размясцілі ў старэйшым храме Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы XII стагоддзя. І не выпадкова, бо князь мог быць у гэтай царкве. Захоўваецца святыня ў мужчынскім манастыры Падольскай епархіі Узнясенскай Давідавай пустыні, размешчаным у населеным пункце Новы Быт Чэхаўскага раёна Падмаскоўя. Дарэчы, у гэтым манастыры сабрана больш за дзвесці часціц мошчаў угоднікаў Божых. У адным з каўчэгаў — часціца цвіка Укрыжавання Хрыстова. У саборы, асвечаным у гонар іконы Усяміласцівага Спаса, у машчавіках знаходзяцца часціцы хітона Збаўцы і рызы Багародзіцы. Прадстаўнікі манастыра суправаджаюць у Беларусі мошчы Аляксандра Неўскага.

Прынясенне святыні ў Беларусь стала магчымае па блаславеннай Найсвяцейшага Патрыярха Кірыла пры дапамозе дабрачыннага фонду імя святога раўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра. 3 ліпеня ў Віцебску адбыўся хрэсны ход з мошчамі святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага ад храма Дабравешчання Найсвяцейшай Багародзіцы да Свята-Успенскага кафедральнага сабора. 4 ліпеня ўрачыстасці папрасілі ўзначаліць мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Прыехаць у Віцебск запрасілі таксама мітрапаліта Белацаркоўскага і Багуслаўскага Аўгусціна, мітрапаліта Смаленскага і Дарагабужскага Ісідора, мітрапаліта Пскоўскага і Пархоўскага Ціхана і архіерэяў Беларускай праваслаўнай царквы.

У Беларусі больш за сорак храмаў асвечаная ў гонар дабравернага Аляксандра Неўскага. У Мсціславе, Кобрыне і Мар'іной Горцы яны маюць статус кафедральных. У Віцебску будзе яшчэ адзін. — 4 ліпеня адбыўся малебен з нагоды заснавання ніжняга храма ў гонар князя Аляксандра Неўскага будучага Сафійскага сабора. Адбыліся канцэрт на Саборнай Плошчы, свята праваслаўных кулінарных традыцый і выстаўка.

Не раз на ўрачыстасці гучала, што Беларусь цесна звязаная з імем Аляксандра Неўскага. Важнай падзеяй стаў саюзны дагавор з Віцебска-Полацкім князем Брачыславам Васілевічам і князем Аляксандрам, заключаны ў 1239 годзе. Гэта быў першы дзяржаўны саюз Белай і Паўночна-Усходняй Русі. У гэтым жа годзе быў заключаны шлюб паміж князем Аляксандрам і князёўнай Аляксандрай Брачыслаўнай (Параскевай), з роду полацкіх князёў. Яе бацька — Брачыслаў Васількавіч быў Віцебскім князем, апошнім з дынастыі Рурыкавічаў. Ад іх шлюбу нарадзіліся пяць дзяцей. Адзін з іх — Васіль, выхоўваўся ў Віцебску, а князь Даніла стаў першым Маскоўскім князем. Такім чынам, з найстаражытнейшых часоў паўночныя землі сучаснай Беларусі падтрымліваюць кроўную сувязь з Расіяй.

Пасля Віцебска мошчы святога будуць знаходзіцца ва ўсіх епархіяльных гарадах Беларусі: у Полацку — да 6 ліпеня, Лідзе — з 6.07 да 8.07, Маладзечне — з 8.07. да 10.07, Навагрудку — з 10.07 да 12.07, Гродне — з 12.07 да 14.07, Брэсце — з 14.07 да 16.07, Баранавічах: з 16.07 да 18.07, Слуцку — з 18.07 да 20.07, Мазыры — з 20.07 да 22.07, Гомелі — з 22.07 да 24.07, Магілёве — з 24.07 да 26.07, Бабруйску — з 26.07 да 28.07, Барысаве — з 28.07 да 30.07, Мінску — з 30.07 да 02.08.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ООО «Рестор групп», извещает о проведении торгов по продаже имущества – ОБОРУДОВАНИЯ, МЕБЕЛИ, МАТЕРИАЛОВ ОБЪЕКТА ОБЩЕСТВЕННОГО ПИТАНИЯ.

**Торги будут проведены 09 августа 2021 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, оф. 316.**

Организатором торгов является ликвидатор ООО «Рестор групп» – Лапатин Юрий Геннадьевич.

**Заявки на участие в торгах принимаются до 15.00 06 августа 2021.** Прием заявок и документов на участие в торгах, а также ознакомление с перечнем имущества и его стоимостью осуществляет организатор торгов – Лапатин Юрий Геннадьевич – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 17.00 по адресу: 220053, г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, оф. 316, тел. +375-33-363-71-27.

Общая начальная цена имущества – 217 207,45 руб, продажа имущества будет осуществляться поштучно согласно перечню.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе; копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в размере 1 % от стоимости имущества, на приобретение которого претендует заявитель, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет ООО «Рестор групп», BY33OLMP30121000457420000933, открытый в ОАО «Белгазпромбанк». Шаг торгов составляет 1 % от начальной цены предмета торгов.

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производятся победителем аукциона по фактическим затратам. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права собственности, несет покупатель.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

УНП 191045412

---

Государственное предприятие
«УКС Фрунзенского района г. Минска»

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,

ранее опубликованную в газете «Звязда» от 04.06.2021 № 104 (29473).

Застройщик – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А.

Тел./факс: (8017) 361 67 99; (8017) 399 53 94; (8017) 370 84 18, (8044) 785 84 81; (8029) 323 11 11.

Режим работы – приемное время: понедельник, среда с 8.45 до 13.00; вторник, четверг – с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

В декларацию по объекту «Многоквартирный жилой дом № 4 по генплану в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 4 (5-я очередь строительства)» внести изменения следующего содержания:

«цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 4 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет: для нормативной площади – 1 619,68 бел. рубля; для площади, превышающей нормативную, – 2 050,00 бел. рубля.»

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ООО «Вариант», г. Минск, ул. Павловского, д. 11, комн. 37, литер Ж 1-2/К** |
| **Антикризисный управляющий** | **ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК», УНП 190816859, 220062, Минск, проспект Победителей, д. 141, офис 442** |

**Предмет аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении**
**Местонахождение: Брестская область, Березовский р-н, с/с Березовский, 7**

| № лот | Наименование | Начальная цена без учета НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Полуприцеп «MAZ 93866», 1994 г. в., рег. знак 9794АА | 2 400,00 | 120,00 |
| 2 | Грузовой автомобиль «Mudan MD 1042 D», 2008 г. в., рег. знак АВ 2713-1 | 4 700,00 | 235,00 |
| 3 | Прицеп «Pricep Samodelnyi», 1995 г. в., рег. знак 9795АА | 920,00 | 46,00 |
| 4 | Мотоцикл «MMVZ 3.112 14», 2004 г. в., рег. знак 0583АВ | 480,00 | 24,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни по предварительному согласованию, контактный телефон +375 (29) 722-21-31

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются ст.ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до **17.00 06.08.2021** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол.

В случае если торги признаны несостоявшимися в связи с тем, что на участие в них подано заявление только одним участником торгов либо для участия в них явился только один участник, в протокол вносится информация о согласии на покупку этим участником торгов предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять) рабочих дней** со дня проведения торгов |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 7 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 09.08.2021** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 06.07.2021 по 06.08.2021** до 17.00 по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 28 июля 2021 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр»

| Предмет торгов |
|---|
| Производственный корпус № 1 общей площадью 3523 кв. м, инв. номер 611/С-2660; производственное здание общей площадью 3861,1 кв. м, инв. номер 611/С-9297; испытательная станция общей площадью 440,9 кв. м, инв. номер 611/С-10364; подстанция КТП общей площадью 40 кв. м, инв. номер 611/С-10368; хозпостройка общей площадью 376,9 кв. м, инв. номер 611/С-2659; открытый металлический навес с испытательными боксами общей площадью 549,1 кв. м, инв. номер 611/С-30483; сети хозяйственно-питьевого и противопожарного водопровода, инв. номер 611/С-31529; сети тепловые, инв. номер 611/С-31527; канализационные сети, инв. номер 611/С-31528; сооружение очистные V=250 м³, инв. номер 611/С-31526; сети слаботочные внутриплощадочные, инв. номер 611/С-33332 |
| Местонахождение: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Марии Романович, д. 21 |
| Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 620450100001000588, площадь – 4,7852 га |
| Начальная цена: 1 011 100,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 101 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «НПО Центр», ул. Шаранговича, 19, комн. 304, 220018, г. Минск, (017) 259-03-57.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «НПО Центр», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **28 июля 2021** года в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 07.07.2021 по 26.07.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 259-05-54 (ОАО «НПО Центр»).

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 259-05-54 (ОАО «НПО Центр»)**

---

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **по переулку 5-му Ясногорскому, 16** (площадь застройки – 137 кв. м, готовность 12 %) и земельный участок | 140100000001032868 | 0,1073 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **26 398,36** | 5 200,00 | **2 817,38** | 0,0027 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления) | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |
| 2 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, по **улице Засима, 61** (площадь застройки – 199 кв. м, готовность 9 %) и земельный участок | 140100000001022799 | 0,1082 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **42 120,62** | 8 400,00 | **2 882,44** | 0,0048 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0447 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | **2 900,00 рублей** |

| | |
|---|---|
| **Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92** | **Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 30.07.2021 г.** |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок) за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть оплаты предмета аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 05 августа 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал**
**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 06.07.2021 г. до 16.00 30.07.2021 г. (перерыв – с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.**
**Контактный телефон 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

# «З ЛЮБОЎЮ Ў СЭРЦЫ І АКТЫЎНАЙ ЖЫЦЦЁВАЙ ПАЗІЦЫЯЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Знакавай падзеяй для змены ў грамадскай свядомасці стаўлення да педагагічнай прафесіі стала наведванне кіраўніком дзяржавы ў 2014 годзе нашага ўніверсітэта — у дні святкавання яго стагоддзя. Да гэтага моманту ўжо было прынятае рашэнне аб забеспячэнні льготнага паступлення медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай на педагагічныя спецыяльнасці. А БДПУ выступіў з ініцыятывай увядзення профільнай педагагічнай падрыхтоўкі ў 10-11 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі. Гэта ідэя знайшла падтрымку на дзяржаўным узроўні, і ўжо ў 2015/2016 навучальным годзе першыя педагагічныя класы і групы адкрыліся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Спачатку іх было крыху больш за сотню. А ў 2018/2019 навучальным годзе ў 420 педагагічных класах ва ўсіх абласцях і сталіцы навучалася ўжо каля 4400 старшакласнікаў — іх колькасць павялічылася ў чатыры разы. На платформе інтэрнэт-партала БДПУ быў створаны сайт «Педагагічныя класы». Вынікі ўступных кампаній апошніх гадоў сведчаць пра тое, што педагагічная прафілізацыя паспяхова вырашае задачу па падрыхтоўцы ў школе матываваных і паспяховых навучэнцаў, якія свядома выбіраюць педагогіку. Штогод трэціна выпускнікоў педагагічных класаў (а гэта, заўважу, высокаматываваныя на педагагічную прафесію маладыя людзі, якія атрымалі рэкамендацыі педагагічных саветаў) прыходзяць у ВНУ на педагагічныя спецыяльнасці. Выпускнікі педкласаў дэманструюць пры навучанні ў нашым універсітэце добрую паспяховасць, яны акадэмічна не менш паспяховыя, чым медалісты, пры гэтым (што вельмі важна для нас) сацыяльна актыўныя. Практычна ўсе займаюцца валанцёрскай




**Удзельнікі праекта «Студэнт на адзін дзень у БДПУ», якія прайшоў падчас вясенніх канікул.**

работай пад кіраўніцтвам цьютараў-старшакурснікаў, з'яўляюцца старастамі груп, уключаюцца ў рэалізацыю адукацыйных і сацыяльных праектаў, становяцца ўдзельнікамі студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый. Яны складаюць касцяк студэнцкіх актываў факультэтаў і інстытутаў. І самы пераканаўчы аргумент на карысць павышэння прэстыжу педагагічнай прафесіі — гэта вынікі прыёмных кампаній. У БДПУ ў апошнія гады прыходзяць вельмі моцныя абітурыенты: медалісты, уладальнікі «чырвоных» дыпломаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, выпускнікі педагагічных класаў. На чвэрць спецыяльнасцяў залічаны толькі льготныя катэгорыі абітурыентаў: медалісты, выдатнікі, выпускнікі педкласаў і мэтавікі. Змяняецца і гендарны склад: да нас паступае ўсё больш юнакоў, а на некаторых факультэтах іх ужо да 65 % ад агульнай колькасці.

На васьмі спецыяльнасцях прахадны бал склаў летась 300 і больш. Сярод лідараў — «Псіхалогія» (317 балаў) і «Практычная псіхалогія» (316 балаў), «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» (315 балаў), «Лагапедыя» (313 балаў). Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў каля двух чалавек на месца. Напрыклад, на спецыяльнасці «Спартыўна-турысцкая дзейнасць (менеджмент у турызме)» конкурс быў 7,8 чалавека на месца, а на «Выяўленчым мастацтве і камп'ютарнай графіцы» — 4,8.

Некалькі апошніх гадоў БДПУ не адчувае «сіндрому апошняга дня», калі абітурыенты ў апошні момант «перакідваюць» дакументы са спецыяльнасці на спецыяльнасць або з адной ВНУ ў іншую. Значыць, большасць абітурыентаў матываваныя на атрыманне педагагічнай прафесіі і свой выбар робяць свядома.

У дні адкрытых дзвярэй, падчас прыёмнай кампаніі і выпускнікі, і іх бацькі адзначаюць, што бачаць сёння шмат пераваг у педагагічнай прафесіі: гэта стабільная праца са стабільнай заработнай платай, шырокія магчымасці для працаўладкавання, працяглы адпачынак летам.

## НА НАВУКОВАЙ АСНОВЕ

***— Расійская акадэмія адукацыі, членам якой вы сталі, аб'ядноўвае вучоных, якія займаюцца фундаментальнымі і прыкладнымі навуковымі даследаваннямі па найважнейшых праблемах адукацыі, педагогікі, псіхалогіі і сумежных з імі навук. Ёсць меркаванне, што ў нашай краіне ў педагагічнай навуцы не адбываецца нічога «рэвалюцыйнага», што прымаюцца рашэнні, якія не абапіраюцца на навуковы аналіз тых ці іншых працэсаў. Быць ці не быць профільнаму навучанню на старшай ступені школы, вырашалі палітыкі, а не прафесіяналы... А як забяспечваецца навуковае суправаджэнне профільных педагагічных класаў?***

— Укараненне педагагічнай прафілізацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пачалося ў 2015 годзе. Старт быў адразу масавы, і трэба было ў самыя кароткія тэрміны прадумаць саму сістэму і навукова, метадычна і арганізацыйна яе забяспечыць.

Для падтрымкі педагагічных класаў навукоўцамі БДПУ і Гродзенскага інстытута развіцця адукацыі была распрацавана вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў педагагічную прафесію» для 10-11 класаў. Яна разлічана на 140 гадзін і ўключае два педагагічныя і два псіхалагічныя модулі. Акрамя гэтага, у дапамогу педагогам мы распрацавалі метадычнае суправаджэнне факультатыўных заняткаў для ўсіх чатырох модуляў праграмы. Дадзеныя матэрыялы знаходзяцца ў свабодным доступе на сайце «Педагагічныя класы» на інтэрнэт-партале БДПУ. Хацеў бы адзначыць, што згаданы сайт з'яўляецца асноўнай інфармацыйна-камунікацыйнай пляцоўкай для ўзаемадзеяння навучэнцаў, педагогаў і адміністрацыі школ, у якіх створаны педагагічныя класы.



**Цэнтр сучасных методык у дашкольнай адукацыі адкрыўся ў БДПУ ў Міжнародны дзень аховы дзяцей.**

На працягу шасці гадоў мы забяспечваем вучэбна-метадычнае і арганізацыйнае суправаджэнне дзейнасці педкласаў. У 2017—2018 гадах па заданні Міністэрства адукацыі калектыў навукоўцаў БДПУ выконваў навукова-даследчую працу «Распрацоўка навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ў профільных класах педагагічнай накіраванасці на аснове інтэграцыі практыка-арыентаванага і кампетэнтнаснага падыходаў». У выніку мы стварылі вучэбна-метадычны комплекс для эфектыўнай арганізацыі і правядзення факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў педагагічную прафесію», які ўключае «Дзённік самадыягностыкі для навучэнцаў», «Атлас педагагічных прафесій і роляў», рабочыя сшыткі для вучняў 10 і 11 педагагічных класаў, распрацавалі мультымедыйныя навучальныя трэнажоры, якія могуць выкарыстоўвацца як на занятках пры суправаджэнні настаўніка, так і для самастойнай работы навучэнцаў.

БДПУ, абласныя ВНУ, інстытуты развіцця адукацыі праводзяць пастаянную работу па павышэнні кваліфікацыі педагогаў, якія працуюць у педагагічных класах і групах, на асенніх, зімовых і вясенніх канікулах арганізоўваюць для іх семінары-практыкумы, круглыя сталы і анлайн-кансультацыі.

А навучэнцаў педагагічных класаў мы стараемся далучаць да розных рэспубліканскіх мерапрыемстваў: гэта канферэнцыі, фестывалі, конкурсы, праекты, форумы і г. д. Напрыклад, кожны год у дні школьных канікул у БДПУ рэалізоўваецца праект «Студэнт на адзін дзень». З 2016 года ў нас праводзіцца традыцыйная міжнародная канферэнцыя «Педагагічныя класы: вопыт і перспектывы». Усе гэтыя мерапрыемствы і актыўнасці маюць вельмі важны эфект, бо многіх падлеткаў, якія прыязджаюць у БДПУ, мы бачым потым у якасці абітурыентаў на сумоўі, а пазней — у якасці студэнтаў універсітэта.

## НАВУЧАННЕ «НА ПЕРАДАВОЙ»

***— Адна з задач, якія стаяць перад сістэмай адукацыі, — пераход на кампетэнтнасны змест агульнай сярэдняй адукацыі. Ці ўлічваеце вы гэты аспект пры падрыхтоўцы будучых педагогаў? Ці ўдалося перадолець разрыў паміж тэорыяй і практыкай, бо ад педагога патрабуецца ўменне прымяніць свае веды ў любой сітуацыі, а не толькі ў стандартнай...***

— Сучасныя адукацыйныя трэнды задаюць арыенціры ў прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў для сістэмы адукацыі. У сувязі з гэтым тры гады таму калектыў навукоўцаў БДПУ распрацаваў праект прафесійна-кваліфікацыйнага стандарту педагога. У ім знайшла адлюстраванне новая кампетэнтнасная мадэль, якая арыентуе на фарміраванне ў педагога шырокага спектра новых, запатрабаваных кампетэнцый: для работы ў лічбавым адукацыйным асяроддзі, для работы ва ўмовах інклюзіўнай адукацыі, для ўстойлівай прафесійнай самарэалізацыі, для жыцця ў полікультурным свеце, кампетэнцыі ў галіне ўстойлівага развіцця і іншых.

Сёння асабліва актуальная падрыхтоўка педагога да фарміравання ў школьнікаў функцыянальнай пісьменнасці. Наша краіна ўпершыню ў 2018 годзе прыняла ўдзел у міжнародным даследаванні PISA, дзе правяраюцца не проста веды вучняў, а іх здольнасць прымяняць атрыманыя веды ў жыцці. Вынікі даследавання паказалі: каб ствараць на ўроках умовы для фарміравання ў школьнікаў чытацкай, прыродазнаўча-навуковай і матэматычнай кампетэнтнасці, патрабуецца найперш гатоўнасць самога педагога. І цяпер навуковыя калектывы БДПУ ў рамках галіновай навукова-тэхнічнай праграмы працуюць у гэтым кірунку: ствараюць навукова-метадычнае забеспячэнне, якое дазволіць падрыхтаваць будучых педагогаў да работы з вучнямі на аснове кампетэнтнаснага падыходу.

Патрабаванні прафесійнага стандарту звязаны з узмацненнем практыка-арыентаванай накіраванасці педагагічнай падрыхтоўкі. Гэту задачу мы паспяхова вырашаем праз удасканаленне педагагічнай практыкі студэнтаў, наданне ёй бесперапыннага характару. Нашы студэнты асвойваюць прафесійныя кампетэнцыі, прыходзячы на практыку ў найлепшыя дзіцячыя сады, школы і гімназіі горада Мінска ўжо з першага курса. На працягу апошніх чатырох гадоў у БДПУ паспяхова апрабаваны і ўкаранёны на ўсіх факультэтах такія інавацыйныя формы педагагічнай практыкі, як валанцёрская практыка на першым курсе, педагагічная практыка з вылучэннем аднаго «школьнага дня» ў тыдзень для студэнтаў другога курса, педагагічная і летняя практыкі для студэнтаў трэцяга курса, пераддыпломная практыка на чацвёртым курсе. Такім чынам, будучыя педагогі максімальна рана паглыбляюцца ў прафесійнае асяроддзе і паступова ўваходзяць у педагагічную прафесію.

У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй летась паспяхова быў рэалізаваны праект «Будучыя педагогі — дзецям», падчас якога студэнты-практыканты праводзілі дыстанцыйныя навучальныя заняткі, распрацоўвалі і запісвалі відэаўрокі. Цяпер гэты вопыт, які даказаў сваю эфектыўнасць, знайшоў адлюстраванне пры канструяванні новых адукацыйных стандартаў, навучанне па якіх распачнецца ва ўсіх рэгіёнах Беларусі з верасня 2021 года.

## СПАРТЫЎНЫ, ПРАГРЭСІЎНЫ І ПРАСУНУТЫ...

***— А які, на ваш погляд, павінен быць сучасны настаўнік?***

— Сучасны педагог — гэта «лічбавы» настаўнік, прагрэсіўны і прасунуты карыстальнік інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, спартыўны чалавек, які вядзе здаровы лад жыцця. Ён валодае тэхналогіямі медыяцыі, прадукцыйнай камунікацыі, знаёмы з камунікатыўнымі кодамі пакалення Z (сучасных падлеткаў), пакалення Y (іх бацькоў) і пакалення X (дзядуль і бабуль).

Я неаднаразова казаў, што нам неабходна працаваць на апярэджанне, разумець, што ў эпоху, калі галоўным рэсурсам цывілізацыйнага развіцця становяцца не прыродныя багацці, а чалавечы капітал, імкліва ўзрастае роля настаўніка з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, з глыбокай любоўю ў сэрцы да дзяцей, сваёй прафесіі і сваёй радзімы. Настаўніка, які валодае новымі, запатрабаванымі жыццём кампетэнцыямі, у ліку якіх — кампетэнцыі ў галіне ІТ-тэхналогій, інклюзіі, педагагічнай падтрымкі, кампетэнцыі, якія дазволяць праектаваць яму сваю жыццёвую і прафесійную траекторыю, развівацца і самаадукоўвацца на працягу ўсяго жыцця, знаходзіць аптымальныя рашэнні ў нестандартных прафесійных сітуацыях. Неабходна рыхтаваць настаўніка, здольнага апярэджваць сацыяльную сітуацыю развіцця сучасных «лічбавых» дзяцей.

***— У красавіку ва ўніверсітэце прайшло размеркаванне. Ці ўдалося вам задаволіць усе заяўкі?***

— Сёлета мы размеркавалі 709 выпускнікоў, якія навучаліся за кошт бюджэту (681 выпускніка першай ступені і 28 выпускнікоў магістратуры), у тым ліку 203 мэтавікі. 14 выпускнікоў-платнікаў таксама папрасілі аб размеркаванні. 80 % выпускнікоў размеркаваліся ў Мінск і Мінскую вобласць. На кожнага выпускніка мы мелі па дзве-тры заяўкі для размеркавання.

***— Педагагічныя навыкі — уменне размаўляць з людзьмі, дасягаць разумення, разбірацца ў складаных знакавых сістэмах, навыкі каманднай работы — патрэбныя не толькі ў сістэме адукацыі. Таму людзей з педагагічнай адукацыяй сёння можна сустрэць у самых розных сферах. Вы можаце назваць прозвішчы самых вядомых вашых выпускнікоў, якія ва ўсіх на слыху?***

— Гэта народныя паэты Пімен Панчанка і Аркадзь Куляшоў, міністр адукацыі Ігар Карпенка, член-карэспандэнт, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя, былы генеральны дырэктар НВА «Пеленг», які ўзначальваў інавацыйнае прадпрыемства больш як два дзесяцігоддзі, лаўрэат дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі Уладзімір Пакрышкін, намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр Цуран, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Абрамаў, эстрадная спявачка Алёна Свірыдава, тэлевядучыя Надзея Цімафеева і Глеб Давыдаў, чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка Алена Бялова, параалімпійскі чэмпіён Юрый Голуб. Я магу працягваць гэты спіс доўга...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Цалкам чытайце інтэрв'ю на сайце zviazda.by.**

**Фота прадастаўлена прэс-службай БДПУ.**

# САКРЭТ КУПАЛЛЯ РАСКРЫЕ ДРЭВА

### На ўзроўні высокага мастацтва

Конкурс-пленэр — яскравы прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Ён з'явіўся па ініцыятыве канцэрна «Беллеспапераправм» і праводзіцца пры падтрымцы Беларускага прафсаюза работнікаў лесу і прыродакарыстання, а таксама Бабруйскай асацыяцыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. З самага пачатку статус пленэру быў высокі. У якасці яго партнёраў выступалі такія сур'ёзныя арганізацыі, як Банк развіцця, АСБ «Лізінг». Ацэньваюць работы рэзчыкаў мастакі высокага ўзроўню. Сёлета, напрыклад, журы ўзначаліў загадчык кафедры Акадэміі мастацтваў Міхаіл Шыкаў. У склад журы ўвайшлі старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб Отчык, скульптар Дзмітрый Аганаў. Для ўдзельнікаў пленэру трымаць справаздачу перад такімі экспертамі свайго роду — экзамен.



База адпачынку прадпрыемства «ФанДАК» выбрана для спаборніцтваў невыпадкова. Тут ёсць усё, што трэба для конкурсу-пленэру: пляцоўка, лес, умовы, а яшчэ — традыцыі і вопыт найстарэйшага прадпрыемства дрэваапрацоўчай галіны. «ФанДАКу» як-ніяк болей чым 90 гадоў. Яго дзейнасць пачыналася з тых самых дарэвалюцыйных лесапілак, якімі валодалі тутэйшыя яўрэі. У савецкі час лесапілкі нацыяналізавалі і пабудавалі на іх падмурку фанерны завод. Сёння ён перарос у прадпрыемства, якое вядзе поўную перапрацоўку драўніны: ад лесанарыхтоўкі да канчатковага прадукту. Тут працуе шмат дынастый. Агульны стаж чатырох з іх роўны ўзросту самога прадпрыемства. Што датычыцца рэзчыкаў, то адзін з тых, кім тут ганарацца, — Сяргей Малкаў. Ён пастаянна здзіўляе сваіх прыхільнікаў творчымі знаходкамі. Калегі ведаюць яго як вельмі рамантычную і крэатыўную натуру. Любіць раніцай устаць і паназіраць за прыродай. Адна з яго работ так і называецца — «На золку». Уявіце сабе драўляную вазу ў выглядзе лісця асакі, у якім хаваюцца жыхары вадаёма. Здаецца, дакраніся да яе — і дрэва ажыве.



### З бензапілой і стамескай

Гэта той класічны набор інструментаў, пры дапамозе якіх дрэва атрымлівае зусім іншыя формы. Удзельнікі працуюць у двух намінацыях — «Манументальная скульптура» (а гэта фігуры вышынёй ад двух з паловай метра да чатырох) і «Мастацкая разьба» (дробная скульптура, карціны і іншыя творы мастацтва). У рабоце выкарыстоўваецца выключна дуб. Майстры кажуць, што, калі правільна зрабіць з яго скульптуру, яна можа прастаяць да 500 гадоў. Ліпы або асіны надоўга не хопіць. На кожнага ўдзельніка прадугледжаны куб — паўтара метра драўніны — так што разгарнуцца фантазіі ёсць дзе.

Пленэр унікальны тым, што ў ім могуць удзельнічаць як мэтры, так і пачынаючыя ўмельцы. І апошнія спецыяльна імкнуцца сюды, каб набрацца ведаў. Калі восем дзён праводзіш побач з прафесіяналамі, шмат чаго карыснага для сябе можна пераняць. Ёсць прыклады, калі ўдзельнікі, натхнёныя тутэйшай атмасферай, адкрывалі свае фірмы.

— Мы ствараем усе неабходныя ўмовы для нашых рэзчыкаў, забяспечваем іх пражываннем і харчаваннем, — кажа **намеснік генеральнага дырэктара — начальнік упраўлення па рабоце з персаналам ААТ «ФанДАК» Марына АЎСЯНІК.** — Ад іх чакаем натхнення і творчага палёту.

Першы дзень конкурсу-пленэру адводзіцца знаёмству, засяленню, лёсаванню. Увесь астатні час яны рэжуць, займаюцца аздабленнем дрэва насычальнымі матэрыяламі, каб яно не пашкоджвалася, устаноўкай фігур. Праз месяц-два гэтыя скульптуры бетануюцца, і імі ўпрыгожваюць Бабруйск і іншыя населеныя пункты. Невялічкі міні-парк драўляных скульптур знаходзіцца наўпрост у Вербках.

### І дрэва загаворыць

Мінулы конкурс-пленэр прысвячаўся «Лясной казцы», а цяпер вось — Купаллю. Цікава, як бачаць гэтую тэму майстры? Наколькі ім наогул патрэбныя спаборніцтвы?

**Андрэй ГАНЧАРЭНКА з Краснаполля**, неаднаразовы ўдзельнік мерапрыемства, лічыць, што сюды карысна прыязджаць для прафесійнага росту. Ён працуе настаўнікам тэхнічнай працы ў Краснапольскай сярэдняй школе, а вольны час прысвячае дрэву. Прызнаецца, што перад тым, як ісці ў школу, паўтары гадзіны «медытуе» з дрэвам у сваёй майстэрні.

— Цікавасць да гэтага матэрыялу з'явілася восем гадоў таму, калі трапіў у Дом рамёстваў і ўступіў у Саюз майстроў народнай творчасці, — расказвае ён. — Пачаў ездзіць па розных фэстах, кірмашах, глядзець, як працуюць іншыя людзі. Ад палічак і кухонных дошак паступова перайшоў да лыжак, а ад іх — да скульптуры. І тэма Купалля, як і ўсе іншыя, што датычацца народных традыцый, мне блізкая. Адночы змайстраваў «Дударыка» — хлопца, які граў у купальскую ноч на дудцы і раптоўна пачуў нейкую іншую, нашмат прыгажэйшую, музыку. І застыў, прыслухоўваючыся да яе, зачараваны. Купалле — гэта гісторыя майго народа. Мы ўвесь час шукаем нейкі скарб, а скарб — гэта наша жыццё. Папараць-кветка знаходзіцца не дзесьці там, куды мы ўвесь час імкнёмся, а побач — гэта твой любы чалавек, здароўе.

Майстар любіць дрэва за тое, што яно жывое і дае сілы. Нездарма ж людзі, калі хварэюць, ідуць у лес да дрэў і просяць у іх здароўя. А яшчэ работа з гэтым матэрыялам выхоўвае цярпенне і ўпартасць. А з такімі якасцямі можна дасягнуць пэўных вяршынь нават тады, калі няма мастацкіх здольнасцяў. Зараз Андрэй працуе над серыяй работ на тэму беларускіх прымавак і прыказак, а яшчэ адраджае беларускую драўляную цацку. Вельмі перажывае, што гэтыя здабыткі мы можам страціць.

**Мікалай ЯРАЦ** працуе **дырэктарам Правамастоўскай сярэдняй школы ў Гродзенскай вобласці.** З дрэва ў яго атрымліваюцца сапраўдныя творы мастацтва. З непрывычкі іх можна нават зблытаць з вырабамі са слановай косткі — вельмі тонкія лініі, ідэальна гладкая паверхня. Гэтым разам прыехаць у Бабруйск не атрымалася, але два гады таму прымаў удзел у другім конкурсе-пленэры рэзчыкаў, і яго работа заняла другое месца. Любоў да дрэва ў майстра патомная, перайшла ў спадчыну ад бацькі. Разьбой захапіўся яшчэ ў школе, але паралельна займаўся іншымі мастацтвамі. І хоць ва ўніверсітэце падаваў надзеі як мастак-графік, выбраў усё ж такі скульптуру.

— Такія пленэры вельмі карысныя для майстроў па дрэве, — кажа ён. — Цяжка навучыцца чамусьці, калі сядзіш дома і варышся ва ўласным соку. А тут новыя людзі, новыя ідэі, новыя ўражанні. Ды і ацаніць свой узровень можна толькі ў параўнанні з іншымі.

### Купальскія матывы

Гартаю глянцавы фотаальбом, дзе сабраны фота конкурсных работ за апошнія два гады, і прыходжу ў захапленне. Наколькі ж яны незвычайныя і таямнічыя! Не менш цікава паназіраць за работай рэзчыкаў. І арганізатары конкурсу-пленэру даюць такую магчымасць. У фінальны дзень, калі падводзіцца вынікі болей чым тыднёвай працы, з Бабруйска на базу адпачынку «Вербкі» курсіруе аўтобус. Гэта добры шанц акунуцца ў загадкавую рэчаіснасць Купалля і паглядзець, якой яе ўяўляюць майстры. Яны ж да апошняга трымаюць у сакрэце, чым збіраюцца нас здзіўляць.

— Я 20 гадоў працую на прадпрыемстве, бачыла шмат чаго незвычайнага з дрэва, але гэты конкурс заўсёды адкрывае нешта новае, — прызнаецца Марына Валянцінаўна. — Здавалася б, здзівіць мяне няма чым, але я ў захапленні ад работ нашых майстроў. А тыя, хто ніколі з гэтым не сутыкаўся, перажываюць сапраўднае ашаламленне, моцнае эстэтычнае ўражанне. Здаецца, што трапляеш у іншую рэальнасць.

Акрамя дзвюх названых намінацый — «Манументальная скульптура» і «Мастацкая разьба», — будзе яшчэ і прыз сімпатый гледачоў. Так што ў наведвальнікаў ёсць добрая нагода не толькі натхніцца прыродай і прыгожым мастацтвам, але і ўнесці свой уклад у агульную справу — выбраць свайго — народнага — майстра.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва прадпрыемства «ФанДАК».**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Запрашальнік

# Інсітная краса «Фарбаў роднай старонкі»

**Багатая палітра колераў, спантанныя сюжэты і па-дзіцячы наіўнае адлюстраванне рэчаіснасці — усё гэта ўласціва выстаўцы інсітнага («прымітыўнага») мастацтва, якая адкрылася ў Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці. Экспазіцыя «Фарбы роднай старонкі» налічвае каля 100 палотнаў, прадстаўленых найлепшымі мастакамі-прымітывістамі вобласці.**



Дзевяць таленавітых жывапісцаў дазволілі сабе праігнараваць законы перспектывы і адмовіцца ад строгіх правілаў кампазіцыі. Галоўная ўмова іх творчасці — глядзець на свет вачыма дзіцяці і тварыць так, як патрабуе душа. У аўтараў удала атрымаліся не толькі надзіва «жывыя» пейзажы ды нацюрморты, але і арыгінальныя эксперыменты з пастэллю, керамікай і шоўкам.

Своеасаблівым талісманам выстаўкі абраны казачны «Кот у яблыневым садзе», вобраз якога ўвасобіла алейнымі фарбамі Валянціна Шышпаронак з Бераставіцы. Таленавітая мастачка на працягу многіх гадоў працавала ў галіне будаўніцтва. Дарэчы, усім удзельнікам выстаўкі па жыцці заўсёды ўдавалася сумяшчаць некалькі сур'ёзных заняткаў. Так, Лідзія Шпектарава і Ганна Чуканава, мастачкі з народнага аматарскага аб'яднання «Гарадзенскі каларыт» Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры, доўгі час працавалі на абутковай фабрыцы, Зоя Сярко — у вытворчым аб'яднанні «Азот», Данута Цыбулька-Цвятніцкая — у гандлі, Сяргей Еўдакімаў — на розных прадпрыемствах у якасці мастака-афарміцеля. Вядомая ў Гродзенскім раёне мастачка Ларыса Касіцкая сёння працуе кіраўніком дзіцячага гуртка выяўленчага мастацтва ў аграгарадку Азёры і піша іконы... на страусавых яйках. Алена Піразева з Навагрудка захапляецца інкрустацыяй бяростай, мастацкім роспісам, вышыўкай і актыўна ўдзельнічае ў мясцовым клубе майстроў «Каляровая альтанка».

Нездарма кажуць: чалавек таленавіты — таленавіты ва ўсім. Жывы доказ гэтых слоў — удзельнік выстаўкі Анатоль Кардаш з пасёлка Наваельня Дзятлаўскага раёна. Па прафесіі ён юрыст, з 1989 года займаецца жывапісам. Пейзажы Анатоля Аляксандравіча — сапраўдная крыніца мар для кожнага вандроўніка і аматара адпачынку на ўлонні прыроды! Вядомы на Дзятлаўшчыне творца сваімі рукамі змайстраваў ганчарнае кола і горн, засвоіў выраб глінянага посуду і на гэтым не спыніўся. Новы твор Анатоля Кардаша — аматарскае аб'яднанне «Эпатажны блюз» для наваельненскіх прыхільнікаў танцавальнай культуры.

Мастакі, чые работы да канца ліпеня можна будзе ўбачыць на выстаўцы «Фарбы роднай старонкі», перакананыя, што кожная творчая прыступка ў жыцці — гэта заўжды невялікая нагода для свята. Большасць аўтараў ужо ў досыць паважным узросце, але гэта не перашкаджае ім адчуваць крылы за плячыма і імкнуцца да новых вяршынь.

**Ала БЯЛЬКЕВІЧ,**
**дырэктар Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.**

# Лянота — натуральны стан?

## Ад чаго яна нас выратоўвае і ці варта з ёй змагацца

**Лянота — тое, з чым мы сутыкаемся кожны дзень. З ёй прынята змагацца — мы ўсяляк прымушаем сябе ўстаць з ложка, а не ляжаць да абеду, робім тую непрыемную справу, якую хочацца адкласці на потым, пасля работы займаемся хатнімі справамі ці ідзём у спартыўную залу замест таго, каб пасядзець на канапе... Але медыкі сцвярджаюць, што лянота дадзена нам не проста так — без яе чалавецтва не выжыла б. Таму вынішчаць «пад корань» гэтую якасць у сабе не варта. У якіх выпадках яна карысная і ад чаго нас выратоўвае, а таксама чаму варта прыслухоўвацца да свайго арганізма, мы паразважалі з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГУРБАНІДЖАДАМ.**

***— Гумен, лянота лічыцца не самай станоўчай нашай якасцю...***

— Лянота пайшла ад слова lenus, якое азначае «марудлівы» або «вялы». Насамрэч гэта тайм-аўт, які неабходны нашаму арганізму і нервовай сістэме. Лянота задумана прыродай для таго, каб мы працавалі больш энергазберагальна. Кожная жывая істота мае пэўныя рэсурсы энергіі, і яны не бясконцыя. Для таго каб чалавек ці жывёла бессэнсоўна іх не расходавалі, у нас ёсць лянота, якая не дае нам «газаваць» на пустым месцы і марнаваць абмежаваны рэсурс.

**«Лянота задумана прыродай для таго, каб мы працавалі больш энергазберагальна. Кожная жывая істота мае пэўныя рэсурсы энергіі, і яны не бясконцыя. Для таго каб чалавек ці жывёла бессэнсоўна іх не расходавалі, у нас ёсць лянота, якая не дае нам «газаваць» на пустым месцы і марнаваць абмежаваны рэсурс».**

З іншага боку, лянота — гэта ўнутрыасобасны канфлікт, калі чалавеку штосьці нявыгадна рабіць, але ён робіць, таму што трэба. Калі маці кажа дзіцяці прыбраць у пакоі, яно не хоча гэтага рабіць, але з задавальненнем згодна патраціць час на футбол, прытым што прыбіранне ў пакоі патрабуе нашмат менш энергіі. Так уладкаваны чалавек — не рабіць тое, што яму не трэба. Як той казаў, не адкладвайце на заўтра тое, што вы не збіраецеся рабіць у гэтым жыцці.

Каб выправіць дадзеную сітуацыю і пазбегнуць унутранага канфлікту, работадаўцы выкарыстоўваюць розныя методыкі — стымулы. Калі малпу накіроўвалі ў космас, ёй трэба было націснуць кнопку. Для малпы гэта дзеянне бессэнсоўнае, лішняя трата энергіі, таму прыходзілася яе стымуляваць. Яна націскала на кнопку — і атрымлівала банан, яшчэ раз — яшчэ адзін. Каб прымусіць чалавека рабіць тое, што ён не хоча, ёсць зарплата, прэмія і іншыя спосабы, якія прымушаюць нас пераадольваць сваю ляноту і ўнутраны асобасны канфлікт.

***— Гэта значыць, што лянота дадзена нам не проста так?***

— Найперш яна сігналізуе аб тым, што ў нас знікла канцэнтрацыя ўвагі. Мы ўсе ведаем, што у кіроўцы, які ад'ездзіў шмат гадзін за абаранкам, верагоднасць трапіць у ДТЗ большая, чым у чалавека, які адпачыў. Калі падчас работы з рук пачынае вывальвацца інструмент, гэта сведчыць пра тое, што наш галаўны мозг пертаміўся, нам не хапае канцэнтрацыі, каб выконваць работу дастаткова добра. Калі наша нервовая сістэма фіксуе, што мы не можам дастаткова канцэнтравацца, уключаецца механізм ляноты, яна ўказвае, што нам неабходны перапынак. І тут важна прыслухацца да свайго арганізма і падпарадкавацца ляноце. Яна дапамагае нам адпачыць і пасля больш эфектыўна займацца разумовай ці фізічнай работай.

Яшчэ лянота, як ні дзіўна, патрэбная для захавання здароўя і падаўжэння жыцця. Як вядома, калі арганізм працуе ў рэжыме нон-стоп, ён больш зношваецца, у такіх людзей працяглаcць жыцця меншая. Напрыклад, адна з даследчых работ прыводзіць такія даныя датычна журналістаў, бо іх жыццё больш актыўнае, стрэсавае, і працуюць яны ў напружаным рэжыме. Гэта мы бачым і на прыкладзе жывёл: у тых, што вядуць больш спакойны спосаб жыцця, ніжэйшая верагоднасць зікнуць з планеты. Кракадзілы засталіся з часоў дыназаўраў і яшчэ доўга будуць жыць. А вядуць яны больш чым размераны спосаб жыцця: актывізуюцца толькі тады, калі нападаюць на здабычу. На працягу года ім патрэбная невялікая колькасць мяса ў параўнанні з ільвом, які шмат рухаецца.

***— Але як знайсці гэты баланс, улічваючы што медыкі раяць нам, наадварот, шмат рухацца?***

— А чаму так раяць? Гэта наступствы цывілізацыі і таго спосабу жыцця, які яна нясе. Тысячу гадоў таму чалавек, каб паесці, мог некалькі гадзін ганяцца за здабычай. І яго не трэба было заклікаць у спартзалу — актыўнасць была натуральная. Калі чалавек быў неактыўны, ён проста не мог выжыць. Цяпер жыццё патрабуе ад нас зусім іншых задач. Аднак калі ляжаць на канапе пасля таго, як восем гадзін прасядзелі ў офісе, паступова аслабляюцца мышцы, сэрца, ды і ўвесь арганізм пачынае працаваць па-іншаму. Селяніну, які дзень працуе на полі, зноў-такі ўвечары ісці ў спартыўную залу не трэба. Дадаваць фізічную актыўнасць мы рэкамендуем людзям, якія вядуць гарадское жыццё — сядзяць у офісе, ездзяць на машыне.

***— Вернемся да ляноты. Ад чаго яшчэ яна нас аберагае?***

— У прыватнасці, абараняе наш мозг ад перагрузкі. Мы ведаем, як некаторыя студэнты рыхтуюцца да экзамена ў апошнюю ноч. У рэшце рэшт наступае такі момант, калі мозг нічога не ўспрымае, у гэты час ужываюць чай ці каву, каб



Фота habr.com

прымусіць яго працаваць. Аднак радыкальна гэта нічога не мяняе, магчыма, падаўжае работу на 30-40 хвілін, і зноў наступае стан пертамлення. І тут таксама ўключаецца механізм ляноты, калі арганізм сігналізуе: стоп, мне патрэбна перазагрузка. Нездарма кажуць: пераначуем — болей пачуем. Калі мы спім, мозг перазагружаецца і назапашвае ў сабе тыя рэчывы, якія выпрацоўваюцца толькі ў сне і расходуюцца днём. Таксама пазбаўляемся ад таксічных рэчываў, якія выпрацавалі падчас разумовай работы. Гадзіна ці паўгадзіны сну дапамагаюць назапасіць больш інфармацыі, чым калі мы не спім усю ноч. Каб павялічыць эфектыўнасць работы, у Паўднёвай Еўропе, Кітаі, Японіі ўводзяць сіесту. Для нас гэта, вядома, экзотыка, хоць нават у Расіі некаторыя кампаніі яе прымяняюць. На першы погляд здаецца, што работадавец плаціць работніку за тое, што той спіць. Насамрэч ад 20 да 40 хвілін, якія адводзяцца на сон, павялічваюць працаздольнасць і канцэнтрацыю работніка, пасля чаго яго эфектыўнасць нашмат павышаецца.

**«Ніхто, акрамя нас саміх, не зробіць нас шчаслівымі, наша жыццё знаходзіцца ў нашых руках. Заўсёды трэба гэта памятаць. Кожны чалавек мусіць дасягнуць пэўных важных для яго мэт. І калі яны ёсць і мы да іх імкнёмся, знікаюць млявасць і лянота».**

Вядомы закон дысбалансу — так званы прынцып Парэта. Яго сутнасць у тым, што 20 % намаганняў даюць 80 % выніку. А для таго каб атрымаць астатнія 20 % выніку, трэба працаваць з 80 % намаганняў. Таксама лічыцца, што 20 % работнікаў выконваюць 80 % работы, а 80 % работнікаў — толькі 20 %. Чаму так адбываецца? Мозг у 20 % людзей так пабудаваны, што спачатку яны выконваюць важныя работы, а потым усё астатняе. А 80 % з нас выконвае тэрміновыя работы. А для таго каб мозг дакладна вызначыў, якія работы тэрміновыя, а якія важныя, патрэбныя работа нашай падсвядомасці і паўнацэнны адпачынак. Універсітэтам Брытанскай Калумбіі было праведзена навуковае даследаванне. Дзве групы людзей гулялі ў камп'ютарныя гульні. Палова атрымала джойсцікі, якія працавалі паўнавартасна, а другая палова — прылады з дэфектам. І калі гэтыя людзі спалі, даследчыкі вывучалі работу іх галаўнога мозга. У групе з няспраўнымі джойсцікамі мозг падчас сну выпрацоўваў алгарытм для далейшых дзеянняў. І на наступным этапе яны больш эфектыўна выконвалі задачу. Гэта зноў-такі сведчыць пра тое, што лянота з'яўляецца, каб мозг перазагрузіўся і хутчэй знайшоў рашэнне. Мы адпачываем і, як ні парадаксальна, атрымліваем лепшы вынік.

***— Атрымліваецца, каб знайсці вырашэнне нейкай праблемы, якая нас мучыць, дастаткова часам проста паспаць...***

— Вядома, што такія вучоныя, як Ньютан, Архімед, Мендзялееў, калі верыць гісторыі, зрабілі свае важныя адкрыцці, калі адпачывалі. Такую з'яву мы называем інсайтам — калі чалавек раптоўна штосьці спасцігае ці ўсведамляе. Тлумачыцца гэта тым, што падчас адпачынку падсвядомасць пачынае аналізаваць тую інфармацыю, якую яна назапасіла дагэтуль. І такім чынам наступае азарэнне.

***— Кажуць, што найлепшы адпачынак — змена дзейнасці. Папрацаваў за камп'ютарам — выйдзі на прабежку ці пакалі дровы...***

— Гэта так, але не заўсёды. Калі мы кажам дзіцяці адпачыць, каб яно пасля лепш справілася з дамашнімі заданнямі, а тое ўключае камп'ютарную гульню, гэта не адпачынак: стомяцца вочы, нервовая сістэма, мозг пачне горш працаваць. Пасля гэтага, пасадзіўшы яго за кнігі, мы не атрымаем лепшы вынік.

***— Як бы мы ні ўхвалялі ляноту, наймальнікі не вітаюць такую якасць у работніках...***

**«Калі арганізм працуе ў рэжыме нон-стоп, ён больш зношваецца, у такіх людзей працяглаcць жыцця меншая. Напрыклад, адна з даследчых работ прыводзіць такія даныя датычна журналістаў, бо іх жыццё больш актыўнае, стрэсавае, і працуюць яны ў напружаным рэжыме».**

— Ген ляноты з'яўляецца лакаматывам для росту нашай цывілізацыі. Калі работадаўцу патрэбен чалавек, які б стварыў нешта новае, такі работнік мусіць быць крыху лянівым. Чалавеку не хацелася штурхаць груз, і ён вынайшаў кола. Ленаваўся скакаць наверх — і прыдумаў лесвіцу, неахвота было крычаць — стварыў гучнагаварыцель... Калі чалавек лянуецца штосьці рабіць, мозг пачынае працаваць і думаць, як аблегчыць задачу, каб менш было затрат энергіі. Так і з'яўляюцца новыя ідэі.

Ёсць вучоныя, якія лічаць, што калі ў чалавека адключыць ген ляноты, атрымаецца ідэальны работнік. Але іншыя даследчыкі ўпэўненыя, што ў такім выпадку спыніцца рух цывілізацыі. Паміж імі ідзе дыскусія, ці настолькі добра развітая наша цывілізацыя, што можна абысціся без гена ляноты.

***— Значыць, важна прыслухоўвацца да сваёй ляноты, а не змагацца з ёй?***

— Вельмі часта — так, бо яна — той рубільнік, які дапамагае арганізму не знясільвацца. Праўда, і змагацца з ёй таксама варта, калі тая не абумоўлена стомленасцю. Але тут трэба звярнуць увагу, што нельга блытаць гультайства з сіндромам хранічнай стомленасці і дэпрэсіяй. Бывае, што прычына ляноты — у пачатку нейкай хваробы. Сіндром хранічнай стомленасці — гэта той стан, які патрабуе сур'ёзнай медыцынскай дапамогі, ён можа мець і вірусную прыроду, і іншыя прычыны. Калі перагрузіць нервовую сістэму больш, чым яна можа вытрымаць, яна аўтаматычна адключаецца. Дэпрэсія, калі чалавеку нічога не хочацца рабіць — уставаць з ложка, прымаць душ, хадзіць на работу, — гэта таксама паталагічны стан. Ён патрабуе лячэння, інакш хвароба хутка робіцца хранічнай, і тады ўжо дастаткова цяжка выцягнуць з яе чалавека.

***— Ёсць людзі, якія і без дэпрэсіі нічога ў жыцці не хочуць рабіць...***

— Гэта сведчыць пра адсутнасць мэты, яны ўвесь час быццам бы чагосьці чакаюць. Каб пераадолець гэта, трэба нагадаць сабе, што ніхто, акрамя нас саміх, не зробіць нас шчаслівымі, наша жыццё знаходзіцца ў нашых руках. Заўсёды трэба гэта памятаць. Кожны чалавек мусіць дасягнуць пэўных важных для яго мэт. І калі яны ёсць і мы да іх імкнёмся, знікаюць млявасць і лянота. Калі наша мэта здаецца недасяжнай, трэба памятаць, што слана мы не можам з'есці адразу — ён вялікі, а наш страўнік маленькі, але мы можам есці яго патрошкі. Таму каб дасягнуць мэты і не ўпасці без сіл, калі нічога не атрымліваецца, варта разбіць вялікую работу на маленькія этапы. І мы дасягнем сваёй мэты — без лішніх затрат энергіі.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР», 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

**Лот № 1.** изолированное помещение с инв. № 200/D-193381 площадью 2928,0 кв. м, расположено на 1-м этаже, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-33, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Обременение: договор аренды № 23 от 22.05.2020 сроком по 21.05.2023. Изолированное помещение с инв. № 200/D-193382 площадью 114,1 кв. м, расположено на 1-м этаже по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-34, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Изолированное помещение с инв. № 200/D-193379 площадью 2366,3 кв. м, расположено на 1-м этаже, антресоль, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-8, наименование – складское помещение, назначение – складское помещение. Обременение: договор аренды № 24 от 14.08.2020 сроком по 22.01.2026, договор аренды № 2 от 21.03.2019 сроком на 5 лет.Изолированное помещение с инв. № 200/D-193380 площадью 1613,5 кв. м, расположено на 1-м этаже по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-32, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Обременение: договор аренды № 25 от 30.10.2020 сроком по 31.10.2025, договор аренды № 5 от 14.05.2018 сроком на 5 лет.

**Условие**: Покупатель подписывает с Продавцом договор купли-продажи по приобретению следующих объектов движимого имущества, в т. ч. возмещению стоимости их оценки: Электрокранбалка г/п 3 т. инв. № 1278 и кран электрический однобалочный г/п 3 т. инв. № 1752, находящиеся в изолированном помещении с инв. № 200/D-193381, кран опорный электрический однобалочный г/п 3 т., инв. № 1754, находящийся в изолированном помещении с инв. № 200/D-193379, кран опорный электрический однобалочный г/п 3 т., инв. № 1753, находящийся в изолированном помещении с инв. № 200/D-193380. Общая стоимость оборудования: 12261,60 бел. руб. с учетом НДС. Стоимость оценки: 201,60 бел. руб. с учетом НДС.

**Нач. цена:** 471 709,78 бел. руб. без учета НДС.

**Задаток:** 47 170,97 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 21.07.2021 в 15.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 06.07.2021 с 08.30 по 21.07.2021 до 10.00. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 19.05.2021.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000001002628 (общая долевая аренда). **Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, на р/с, указанный в протоколе аукциона; в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона и договор купли-продажи движимого имущества (оборудования), оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи предмета аукциона. Возможно предоставление рассрочки оплаты предмета аукциона на срок до шести месяцев по договоренности с Продавцом. *Затраты по подготовке документации по лоту № 1 (паспортизация, регистрация, независимая оценка) составляют 9498,75 бел. руб. с учетом НДС*. **Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.** Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 6114046 Труханович Александр Владимирович.

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**Государственному предприятию «Миноблмясомолпром» – управляющая компания холдинга «Мясомолпром» (Продавец)**.

**Лот № 1:** легковой минивэн VOLKSWAGEN TOURAN, кузов (рама) WVGZZZ1TZ9W059680, г.в. – 2008.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Витебская, 21А.

**Начальная цена с НДС** – 16 920,00 руб.

Аукцион состоится **06.08.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

Утерянное свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя Яковлева Е.О. (регистрационный номер УНП 191759076) **считать недействительным.**

---

Утерянное свидетельство о государственной регистрации производственного частного унитарного предприятия «РИПС» Яковлева О.А. (регистрационный номер УНП 100041253) **считать недействительным.**

---

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже изолированного помещения

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества –
Могилевское областное управление № 700
ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | Капитальное строение общей площадью 66,1 кв. м с инвентарным номером 701/С-8925, расположенное по адресу: Могилевская область, Белыничский район, аг. Головчин, ул. Терешкевича, 9 |
| **Начальная цена продажи** | 5000,00 руб. (пять тысяч рублей 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 833,33 руб. (восемьсот тридцать три рубля 33 копейки) |
| **Сумма задатка** | 250,00 (двести пятьдесят рублей 00 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | **28.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | **В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 27.07.2021 включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222) 632792, моб. 8029-169-39-68 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 250,00 белорусских рублей на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 28 июля 2021 г . с 10.30 до 10.55. В случае нерегистрации в вышеназванное время участник не допускается к участию в аукционе. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 40 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению филиала «Правда-Агро» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ БАНИ

*(составные части и принадлежности: крыльцо)*
**с инв. № 620/С-31376 общей площадью 87,9 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622282000001000252 площадью 0,0597 га (право аренды по 06.09.2110) по адресу: Минская область, Дзержинский район, Добриневский с/с, 27.**

*Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: водоохранная зона реки Жесть вне прибрежной полосы, охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 вольт, охранная зона линии электропередачи свыше 1000 вольт (пл. 0,0184 га).*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 14 880,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 1 488,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 21.05.2020.

Аукцион состоится **27.07.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.07.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (01716) 91 174, 8 (029) 131 01 80.**

УНП 601063830

---

Сітуацыя

# Пенсія была пад пагрозай

### У выніку экспертызы адноўлены запіс у працоўнай кніжцы

**Жыхарка Гродна сутыкнулася са складанай праблемай. Ёй не змаглі налічыць пенсію з-за недахопу працоўнага стажу. Аказалася, што частка запісу ў працоўнай кніжцы была некалі заліта вадкасцю і з цягам часу амаль што знікла. Ва ўсялякім выпадку, разабраць, што там напісана, спецыялісты сацыяльнага ведамства так і не змаглі. Тады жанчына вырашыла звярнуцца за экспертызай.**

Складанасць становішча гродзенкі была яшчэ і ў тым, што ў яе не было ніякіх іншых юрыдычных дакументаў, якія пацвердзілі б стаж работы. Таму ўся надзея ўскладалася менавіта на запіс у працоўнай кніжцы. Жанчына заключыла дагавор на правядзенне судовай тэхнічнай экспертызы дакументаў, каб устанавіць першапачатковы запіс.

— Гродзенка перадала нам свой дакумент — працоўную кніжку, дзе зусім не чыталіся запісы, якія былі зроблены з 1988 да 1997 года. Нам удалося з дапамогай сучаснага высокатэхналагічнага абсталявання цалкам узнавіць змест гэтых запісаў, — паведаміў **старшы эксперт Гродзенскага міжраённага аддзела Дзяржкамітэта судовых экспертыз Антон ГАНЕНКА.** — Бывае, што запісы могуць выгараць на сонцы, іх таксама можна прачытаць, калі правесці адпаведную экспертызу.

На падставе вынікаў судовай экспертызы суд прыняў рашэнне аб прызначэнні жанчыне заслужанай пенсіі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА
## 27 ИЮЛЯ 2021 ГОДА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1*.** Капитальное строение, инв. № 400/С-86562. Назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **линия электроснабжения** 0,4 кВ. Расположено на земельном участке 440100000001007894 (присвоен предварительно). Капитальное строение, инв. № 400/С-86563. Назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **кабельная линия** 6 кВ. Расположено на земельном участке 440100000001007894 (присвоен предварительно). Капитальное строение, инв. № 400/С-101465. Назначение – здание специализированное энергетики, наименование – **трансформаторная подстанция.** Площадь – 38,7 кв. м. Одноэтажное здание. Фундамент бетонный. Стены, перегородки – кирпич. Чердачные перекрытия жел. бетонные. Крыша совмещенная рулонная. Полы бетонные. Дверные проемы – металлические ворота. Расположено на земельном участке 440100000001000927. Адрес (местоположение): г. Гродно, ул. Индустриальная, 5 | | | |
| **Начальная цена** | **14 817,60 руб.** | *Сумма задатка* | *1 481,00 руб.* |
| **Лот № 2*.** Капитальное строение инв. № 400/С-124583. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие (А), цементобетонное покрытие (Б). Площадь 8176,1 кв. м. 1984 года постройки. Расположено на земельном участке 440100000001010157. Адрес (местоположение): г. Гродно, ш. Скидельское, 8, благоустройство | | | |
| **Начальная цена** | **668 880,00 руб.** | *Сумма задатка* | *66 000,00 руб.* |
| **Лот № 3*.** Капитальное строение, инв. № 400/С-124561. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение. Составные части и принадлежности: ограждение (А). Площадь – 565,2 кв. м. 1984 года постройки. Железобетонные панели со столбами ограждения. Расположено на земельном участке 440100000001010157. Адрес (местоположение): г. Гродно, ш. Скидельское, 8, ограждение | | | |
| **Начальная цена** | **5 630,40 руб.** | *Сумма задатка* | *563,00 руб.* |

** – Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Аукцион состоится 27 июля 2021 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 12 июля по 21 июля 2021 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056. Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу http://gki.gov.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛІПЕНЬ

***6 ліпеня, аўторак.*** Можна рабіць стрыжку сёння, калі вы жывяце ў гармоніі са светам, атрымліваючы асалоду ад пастаянства. Хочаце навенькага — сёння нічога не выйдзе.

***7 ліпеня, серада.*** Добры дзень для моднай прычоскі і новых цікавых знаёмстваў. Прыгожая стрыжка захаваецца надоўга.

***8 ліпеня, чацвер.*** Сёння лепш не хадзіць у цырульню, паколькі любыя маніпуляцыі з валасамі пацягнуць за сабой дэпрэсіўны стан.

***9 ліпеня, пятніца.*** Лепш адкласці візіт да цырульніка, пасля стрыжкі валасы могуць стаць непаслухмянымі, дрэнна ўкладвацца і доўга адрастаць.

***10 ліпеня, субота.*** Час адпачынку для валасоў, дайце ім пабыць натуральнымі, пры ломкасці зрабіце ўмацавальную маску.

***11 ліпеня, нядзеля.*** Выдатны дзень для стрыжкі, афарбоўкі валасоў, можна смела адпраўляцца ў цырульню.

***12 ліпеня, панядзелак.*** Тым, у каго рэдкія валасы, проста неабходна падстрыгчыся — высокая верагоднасць зрабіць шавялюру гусцейшай.

***13 ліпеня, аўторак.*** Выдатны дзень для наведвання салона прыгажосці. Стан валасоў пасля стрыжкі палепшыцца, яны стануць здаровымі, моцнымі і неверагодна прывабнымі.

***14 ліпеня, серада.*** Наведванне цырульні палепшыць знешні выгляд. Калі вы зробіце стрыжку, то валасы будуць расці хутка.

***15 ліпеня, чацвер.*** Стрыжка можа змяніць ваша асабістае жыццё ў лепшы бок, але варта ўдумліва падысці да выбару новай прычоскі.

***16 ліпеня, пятніца.*** Добры дзень для новай прычоскі. Спрыяльны дзень для аздараўленчых і агульнаўмацавальных працэдур — яны максімальна эфектыўна паўплываюць на вашы валасы.

***17 ліпеня, субота.*** Добры перыяд для стрыжкі, якая надасць упэўненасці ва ўласных сілах. Таксама можна афарбоўваць валасы: фарба доўга будзе захоўваць насычанасць.

***18 ліпеня, нядзеля.*** Неспрыяльны



дзень, нядзельная стрыжка «адразае» поспех.

***19 ліпеня, панядзелак.*** Стрыжка, зробленая сёння, дапаможа даўжэй пазбягаць пасечаных кончыкаў. Рэкамендуецца таксама афарбоўванне, таніраванне або ламініраванне.

***20 ліпеня, аўторак.*** Калі вы цалкам не задаволены сабой, дапаможа толькі добры майстар. На календары час стрыжак, якія дапамогуць адчуць сябе на хвалі цяпла і паразумення з блізкімі.

***21 ліпеня, серада.*** Стрыжка валасоў у гэты дзень прыцягне любоў і дабрабыт.

***22 ліпеня, чацвер.*** Стрыжка стане ўдалай, валасы стануць больш жывымі, густымі. Іх лепш афарбоўваць у найбольш звыклыя адценні: сёння не лепшы дзень для эксперыментаў.

***23 ліпеня, пятніца.*** Калі ў гэты дзень састрыгчы канцы валасоў, то можна зняць лішні груз, непатрэбную інфармацыю. Валасы ажывуць, амаладзяцца, стануць гусцейшымі, будуць менш выпадаць.

***24 ліпеня, субота.*** Нейтральны час для стрыжкі. Час адпачынку і ўмацавальных працэдур для шавялюры.

***25 ліпеня, нядзеля.*** Падстрыгшыся сёння, вы адчуеце лёгкасць дыхання, свабоду думак і незвычайны палёт фантазіі.

***26 ліпеня, панядзелак.*** Гэты дзень — не лепшы час для любых маніпуляцый з валасамі. Устрымайцеся нават ад мыцця валасоў — скура галавы становіцца вельмі адчувальнай, можа з'явіцца перхаць.

***27 ліпеня, аўторак.*** Паход да цырульніка варта адкласці.

***28 ліпеня, серада.*** Стрыжка можа мець непрадказальныя негатыўныя наступствы, таксама Месяц, які змяншаецца, запавольвае рост валасоў.

***29 ліпеня, чацвер.*** Любыя маніпуляцыі з даўжынёй і колерам валасоў рэкамендуецца перанесці на больш удалы дзень. Інакш валасы могуць стаць непаслухмянымі, пачаць выпадаць больш за норму.

***30 ліпеня, пятніца.*** Спрыяльны перыяд для афарбоўкі і састрыгання лішняй даўжыні валасоў. У цэлым любыя працэдуры з валасамі не расчаруюць, больш за тое — дададуць упэўненасці ва ўласных сілах.

***31 ліпеня, субота.*** Модная стрыжка сёння абяцае цікавае знаёмства. Для афарбоўкі таксама вельмі добры дзень, вы атрымаеце менавіта тое адценне, якое хацелі.

Экаўпакоўка

# Цюбікі для прадуктаў, лекаў, касметыкі

## Як дызайн тары ўплывае на стварэнне трэндаў і продаж

**Цюбік — ідэальны варыянт упакоўкі для шматлікай прадукцыі: харчовай, бытавой «хіміі», лекаў, касметыкі, антысептычных сродкаў. Такая тара зручная ў выкарыстанні дома, на рабоце і ў дарозе, рэчыва з яго можна ўжыць да апошняй кроплі, а прадукт — доўга захоўваецца. Апошнім часам да цюбікаў стала яшчэ больш патрабаванняў — яны павінны быць не толькі зручныя, але і экалагічныя, а таксама прыдатныя для перапрацоўкі. Пра эвалюцыю тубнай упакоўкі расказала спецыяліст.**



Фота аўтара.

### ТАРА — АДНА, СПОСАБАЎ ВЫКАРЫСТАННЯ — ШМАТ

Эксперты лічаць, што першыя цюбікі з'явіліся яшчэ ў 1892 годзе. З тых часоў іх канструкцыя амаль не мянялася, аднак мадыфікаваліся матэрыялы, тэхналогіі і дызайнерскі выгляд гэтай упакоўкі.

— У Беларусі цюбікі распаўсюдзіліся толькі ў 90-я гады мінулага стагоддзя. Перш за ўсё іх у краіне рабілі для касметыкі, бо тут было шмат прадпрыемстваў, якія яе выпускалі, і на падобную тару быў попыт, — згадала **Алена ІВАШЧУК, намеснік дырэктара па маркетынгу і развіцці кампаніі «ЛеанГруп».** — З развіццём тэхналогій цюбікі сталі выкарыстоўваць не толькі для касметыкі і зубной пасты, але і для прадуктаў харчавання. А таксама лекаў і бытавой хіміі.

Спосабаў выкарыстання цюбікаў з часам становіцца ўсё больш. Разнастайныя крэмы, вадкае мыла, сродкі па доглядзе скуры, зубная паста, шампунь... Пералічваць прадукцыю ў тубнай упакоўцы можна бясконца. Год таму праз пандэмію рынак напоўніўся антысептычнымі сродкамі ў цюбіках. Запатрабаваны пакупнікамі прадукт, па жаданні чалавека, таксама можа быць расфасаваны ў тубную тару.

### МІНІМАЛІСТЫЧНЫ ДЫЗАЙН І НЯКІДКІЯ КОЛЕРЫ

Сучасны цюбік — самадастатковая і шматфункцыянальная ўпакоўка, якая засцерагае прадукт, аблягчае яго выкарыстанне і нават «прадае». Таму дызайн тары пакрысе выходзіць на лідзіруючае месца пры выбарзе ўпакоўкі, заўважыла спецыяліст:

— Першае ўражанне ад прадукцыі на паліцах крамаў пакупнік атрымлівае ад упакоўкі, бо ў першую чаргу чалавек арыентуецца на зрокавае ўспрыманне рэчаў. Вытворцы стараюцца прыцягнуць увагу да свайго тавару эфектнымі стылістычнымі рашэннямі «вокладкі» прадукцыі. Раней на цюбіках было больш графічных элементаў — нейкіх карцінак, твараў людзей. Цяпер дызайн тубнай упакоўкі становіцца больш спакойны, лаканічны і эфектны. Як ні дзіўна, але тое, што выглядае проста, часцей за ўсё ўскладняе працэс выбару ўпакоўкі, таму запамінальныя цюбікі з мінімалістычным дызайнам могуць дазволіць сабе толькі кампаніі з самым сучасным абсталяваннем.

Разам з развіццём рынку ўпакоўкі эвалюцыянуе і пакупнік, які становіцца больш пераборлівы і патрабавальны. Людзі навучыліся разбірацца ў прадуктах, параўноўваць іх паміж сабой не толькі знешне, але і па складзе і характарыстыках таго, што ўнутры. Як вынік, павялічваюцца патрабаванні да ўпакоўкі, адзначаюць эксперты.

Цяпер нельга абмяжоўвацца ў тары толькі ўтрымліваннем прадукту, зручнасцю яго транспарціроўкі і выкарыстання. Усё больш важкім становіцца патрабаванне да экалагічнасці цюбікаў і магчымасці далейшай перапрацоўкі выкарыстанай тары.

— Пры гэтым экатрэнд распаўсюджваецца не толькі на матэрыялы, але і на колеравую гаму ўпакоўкі. Пакупнікі аддаюць перавагу натуральным колерам і адценням цюбікаў, якія не кідаюцца ў вочы, — адзначыла Алена Івашчук.

Як паказвае практыка, цяпер у цюбік можна ўпакоўваць практычна любы прадукт, таму наступны крок для гэтай тары на шляху заваявання даверу пакупніка — экалагічнасць.

**Ірына СІДАРОК.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Старобинский» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

<u>Лот № 1:</u>

**КОМБАЙН ЗЕРНОУБОРОЧНЫЙ ДОН-1500Б**

**(категория D) с измельчителем-разбрасывателем, подборщиком, 2005 года выпуска, цвет – зеленый, заводской № 091596, регистрационный № ОМ-5 6837, двигатель марки ЯМЗ-238АК, заводской № 50246667, страна изготовитель – Российская Федерация.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 21 360,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены (**2 136,00** бел. руб.)

Лот № 2:

**ЛЕГКОВОЙ АВТОМОБИЛЬ LADA-212140**

**(легковой джип),**

**2011 года выпуска, цвет – белый, регистрационный № 6680 IE-5, идентификационный № XTA212140B1999760, особые отметки: счет-справка А2096769 от 24.05.2011, страна изготовитель – Российская Федерация.**

Начальная цена с НДС 20 % **– 3 332,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены (**333,20** бел. руб.).

Имущество расположено по адресу: Минская область, Солигорский район, г.п. Старобин, ул. Советская, 24

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона по лоту №1, 10 (десять) процентов – по лоту № 2. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **09.08.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.08.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 324, 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (80174) 29-60-06, (8033) 604-83-64.**

УНП 600071171

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № 2021.Ч.002.00024 по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витрембыт», тел. +375 212 48-70-26.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 48-20-11, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов**: 09.08.2021 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.**

- изолированное помещение с инв. № 240/D-42005, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Черняховского, 7А-1, площадью 327,1 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение.

Места общего пользования: котельная, коридор, тамбур, административное помещение с асфальто-бетонным покрытием, воротами металлическими, забором металлическим, водопроводной сетью, кабельной линией, канализационной сетью, наружной газовой сетью.

Описание составных частей: асфальтобетонное покрытие: материал – асфальто-бетон, площадь – 1388 кв. м; ворота металлические: ворота № 1 длина – 5,0 м, высота – 2,2 м, ворота № 2 длина – 4,1 м, высота 2,0 м; забор металлический протяженностью 60,0 м, материал – сетка рабица на металлических столбах, высота 1,5 м, площадь заполнения ограждения 90 кв. м; водопроводная сеть протяженностью 45,8 м; кабельные линии – кабель АСБ 3*35+1*16 протяженностью 14,1 м, длина 14,1 м, способ прокладки – подземный бесканальный; канализационная сеть общей протяженностью 67,5 м; наружная газовая сеть общей протяженностью 119,9 м.

- Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-37346, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Черняховского, 7А/1, площадью 233,3 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада (далее – имущество).

Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 242400000004001353, расположенном по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Ивана Черняховского, 7А, площадью 0,4181 га, назначение – земельный участок под производственную базу. Земельный участок предоставлен на праве постоянного пользования, доля ОАО «Витрембыт» 93/100.

**Нач. цена:** 369 880,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 36 988,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 06.08.2021. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов:** победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов в соответствии со сметой затрат, оплатить услугу по размещению одного аукциона и затраты на обслуживание ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; оплатить стоимость оценки приобретенного имущества в сумме 676,51 бел. руб. с НДС; заключить договор купли-продажи имущества в течение 14 рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. **Обременения** в отношении изолированного помещения с инв. № 240/D-42005: бессрочный договор аренды № 08/18 от 08.06.2018 г., бессрочный договор аренды № 12/18 от 31.08.2018 г. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (29) 511 46 13.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о внесении изменений в извещение**
по продаже **14.07.2021** принадлежащих ОАО «Миноблавтотранс» **здания склада с инв. № 623/С-39575 и здания станции заправочной, расположенных по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Первомайская, 37**, опубликованное в газете «Звязда» от 22.06.2021:

Оплата объекта, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, производится в следующем порядке: 25 (двадцать пять) процентов стоимости имущества оплачивается в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи, оставшиеся 75 (семьдесят пять) процентов в течение 12 (двенадцати) календарных месяцев с внесением платежей равными долями.

УНП 600013199

Прывіды беларускіх муроў

# ЧОРНАЯ САЖАЛКА, ШКЛЯНЫЯ ТРУНЫ І КІНЕМАТАГРАФІЧНЫ СВІРАН

## Чые нябачныя крокі чуваць у калідорах Прылуцкага палаца

«У адным месцы абапал Птыча-рэкі высяцца дзве горкі дужа красныя, а насярод ракі востраў ляжыць. На той гарэ, што па правым беразе, стаяў двор знатнага баярына, іменем Яраслаў».

Так пачынаецца аповед Каруся Каганца, таго самага, хто, як Дыяген, удзень з ліхтаром у руцэ шукаў беларуса, пра паходжанне назвы вёскі Прылукі.

Вось нібыта была ў таго Яраслава маладая жонка Любляна. Пакуль муж быў на вайне, Любляна пачала жыць з яго сябрам... Думалі, загінуў Яраслаў. А ён вазьмі ды і з'явіся...

«Хапіліся спярша за шаблі, а далей Яраслаў, адумаўшыся, кажа: «Адзін з нас павінен умерці, дык няхай Бог судзіць каму. Вазьмі ты сабе лук і сагайдак з стрэламі і ідзі на гару за рэчку, а я вазьму сабе і стану на гэтай гары, і будзем страляцца».

Як сказаў, так і ўчынілі: выпусцілі па страле — нічога, выпусцілі па другой — нічога, а па трэцяй як выпусцілі, так абодва аж асунуліся, як два падкошаныя каласочкі.

Тое месца з тых пор Прылукамі стала звацца.

### ПОЛАЦКАЯ АПТЭКА Ў ПРЫЛУЦКІМ СВІРНЕ

Сённяшнія Прылукі, аграгарадок пад Мінскам, абраслі легендамі і паданнямі, як мала якая мясціна Беларусі. Містычны куток так і прыцягвае экскурсантаў... Зручна — непадалёк ад сталіцы, дабірацца лёгка — тут і даўней быў тракт, што ішоў на Наваградак, паштовая станцыя... Да таго ж дастаткова добра захаваліся каларытныя будынкі і парк... І нават Чорная сажалка, з якой таксама звязаныя містычныя падзеі. Недарэмна Прылукі любяць кінематаграфісты. Мне давялося тут быць падчас здымак фільма «Авантуры Пранціша Вырвіча» па маім рамане. У адным з захаваных гаспадарчых будынкаў, свірне, упрыгожаным аркамі з калонамі, узнікалі дзякуючы дэкаратарам то сутарэнні Слуцкага замка, дзе акрутны князь Геранім Радзівіл катаваў сваіх вязняў, то аптэка полацкага мудраца Лейбы. Вельмі каларытнае атрымалася спалучэнне — старыя муры, змрочныя скляпенні (не хацелася думаць, што калісьці тут захоўвалі мяхі з зернем ды бочкі з віном), агонь паходняў, дым ад якіх час ад часу даводзілася разганяць падручнымі сродкамі праз вузкія акенцы... І бутафорскія, але вельмі каларытныя краты і ланцугі вязніцы, альбо застаўленыя старадрукамі і шкляніцамі з заспіртаванымі пачваркамі паліцы полацкай аптэкі...

Менавіта тут, у Прылуках, толькі не ў свірне, а ў галоўнай сядзібе, у 1926 годзе здымаўся і першы беларускі фільм «Лясная быль», у якім з'явіліся ў ролях саміх сябе кіраўнікі маладой беларускай рэспублікі Адамовіч, Кнорын, Чарвякоў, і нават «засвяціўся» ў эпізодзе легендарны рэжысёр Корш-Саблін.

Давайце разам перагледзім легенды і паданні пра Прылуцкі замак...

### ФАНТАЗЁР АДЫНЕЦ І ВУПЫРЫ ВІШНЯВЕЦКІЯ

Прывідны флёр Прылукаў узнік найперш дзякуючы аднаму з членаў таварыства філарэтаў, паэту Эдварду Адынцу, рамантыку і містыфікатару, які напісаў баладу пра Прылукі пад красамоўнай назвай «Зачараваны замак». Маўляў, блукаюць там духі ў самых рамантычных традыцыях. Гэта і гатычная гісторыя пра маладую прыслугу, якую пахавалі жывую, і адгэтуль яе прывід блукае па калідорах. Паўплывала і легенда пра тое, што Прылуцкі замак перабудаваны з кляштара, і таму яго муры ахоўваюць былыя мніхі.

Вось толькі навукоўцы кажуць, хоць Адынец пазначыў, што легенда датычыцца менавіта Прылуцкага замка, пісаў ён насамрэч не пра яго, і ўвогуле ўсё выдумаў...

А вось наступныя легенды пра Прылукі звязаныя чамусьці з Вішнявецкімі... Нібыта жыў тут акрутны магнат Тамаш Вішнявецкі, апошні з роду. І настолькі быў ён жорсткі, што трупы сваіх ворагаў выстаўляў у шкляных трунах, каб усе бачылі.

Легенда пра пахаваную жывой прыслугу ў дадзеным выпадку трансфармавалася ў забітую Тамашом нявернную жонку, Селясціну. Пахаваў раўнівец яе таемна, у магіле без помніка. Ну і блукае прывід няшчаснай пані, аплакваючы сваю зямную долю...

А другі Вішнявецкі, які таксама нібыта жыў у Прылуках і нават быў пахаваны ў тамтэйшым склепе, Фердынанд, па начах выходзіў з таго склепа ў найлепшых вупырскіх традыцыях, і гукі яго крокаў палохалі насельнікаў замка...

Вось толькі не значацца сярод уладальнікаў Прылукаў Вішнявецкія, дый род гэты па абедзвюх лініях згас. Апошнім Вішнявецкім па першай лініі быў польскі кароль Міхал, абраны амаль выпадкова, з-за сваёй мяккасці — каб ні вашым, ні нашым, правіў нядоўга, няўдала і спадчыннікаў не пакінуў. Сярод яго іменаў, дарэчы, было і «Тамаш», але сведчанняў, што кароль жыў у Прылуках, я не знайшла. Па другой лініі апошнім мужчынам быў Януш Вішнявецкі, бацька знакамітай Уршулі, жонкі вялікага гетмана Радзівіла Рыбанькі, якой і дасталіся багацці роду, што ўліліся ў радзівілаўскія. І ён на ролю прылуцкага прывіда не падыходзіць.


Сёння ў Прылуцкім замку — Інстытут аховы раслін.



Прылукі — улюбёнае месца здымачных груп.

А вось шкляныя труны з муміямі цалкам маглі ўзнікнуць у народнай фантазіі дзякуючы панскім выкрутасам. Уладары Прылукаў, вядома ж, збіралі розныя калекцыі, займаліся навуковымі даследаваннямі... Сяляне, трапіўшы выпадкова на панскі двор ці ў панскія палаты, маглі ўбачыць і тую ж прывезеную з Егіпта мумію, на якія была ў Еўропе вялікая мода, і якіясьці заспіртаваныя пачваркі — кунсткамеры таксама былі ў вялікай модзе... Вось вам і легенда.

### ЗАБОЙСТВА Ў СУТАРЭННЯХ

Дарэчы, прасачыць узнікненне адной змрочнай легенды мне давялося самой...

Датычыцца згаданая гісторыя таго перыяду, калі Прылукі належалі ўжо сваім апошнім уладарам, Гутэн-Чапскім. Эмерык Гутэн-Чапскі аддаў Станькава, што было непадалёк, старэйшаму сыну Караліо, таму самаму, што зладзіў у Мінску знакаміты бровар, а Прылукі дасталіся другому сыну, Ежы, то-бок Юрыю Чапскаму. Вось ён і перабудаваў канчаткова «зачараваны замак» у палац у неагатычным стылі. Сястра Ежы, Марыя Чапская, пакінула ўспаміны, у якіх сцвярджала, што бацькі набылі Прылукі ў сярэдзіне 1880-х, і «дом будавала папярэдняя ўладальніца Прылукаў пані Горватава ў 1-й палове XIX стагоддзя ў модным тады стылі англійскай готыкі». Пані Горватава, гледзячы па ўсім, дачка мінскага губернскага маршалка шляхты Францішка Оштарпа, жонка агранома Атона Горвата. Здаецца, Прылукі дасталіся ім пасля таго, як Францішак Оштарп у 1851 годзе патануў у Свіслачы. Як пісаў Аляксандр Ельскі, «Яна палац (колішні манастыр), які да таго быў вялікім чатырохвугольнікам, аздобіла крапаснымі зубцамі і вежамі».

Вось толькі будынак пацярпеў падчас пажару ў 1868 годзе, так што Гутэн-Чапскім давялося пачынаць шмат што наноў. Зразумела, у выбары стылю ўладальнікаў натхнялі страшныя легенды і паданні, і дому надавалі гатычнае аблічча. Шмат вежачак, аркі, калоны...

Дык вось, аднойчы трапіў мне ў рукі допіс чытача, які пераказваў сямейную легенду. Нібыта ягоны стрыечны дзед Тамаш, просты селянін з суседняй вёскі Стукацічы, прыгожы і дужы, служыў у асабістым палку спадчынніка трона, будучага Мікалая II. Нават удзельнічаў у яго каранацыі, за што атрымаў медаль. Магчыма, у Санкт-Пецярбурзе і пазнаёміўся з дачкой Ежы Чапскага Палінай. Успыхнула каханне. Знаёмства прадоўжылася на радзіме, юнака і дзяўчыну часта бачылі разам. Урэшце маладыя людзі кінуліся ў ногі Гутэн-Чапскаму, просячы бласлаўлення на шлюб, бо Паліна была цяжарная. Граф, вядома, угневаўся — дачку загадаў замкнуць у капліцы, Тамаша прагнаў. А калі той падземнымі хадамі паспрабаваў прабрацца да любай, наткнуўся на засаду, якую зладзіў дварэцкі. У маладога чалавека ўсадзілі пяць куль.

Цела Тамаша знайшлі на беразе Пцічы. А на калодзежным жураўлі каля дома Тамаша назаўтра раніцой вісела цела Паліны Чапскай — павесілася, не змагла перанесці смерць каханага. Груша бэра, да якой быў прывязаны конь Паліны, перастала пладаносіць, у калодзежы, дзе засілілася дзяўчына, знікла вада...

У расповедзе было шмат праўдападобных падрабязнасцяў, спасылак на сведкаў...

Вось толькі старэйшая дачка Ежы Чапскага Леапальдзіна ў рэальнасці пражыла доўгае жыццё, памерла ў 1969-м, двойчы была замужам, нарадзіла чатырох дзяцей... Іншыя дочкі таксама не засільваліся ў маладосці.

Дапусцім, гаворка была пра жонку Ежы — але і тут легенда не вытрымлівае праверкі. Першая жонка, Юзэфа-Марыя-Караліна Сідонія фон Тун-Гогенштэйн, якая нарадзіла мужу сямярых дзяцей, была з надзвычай вядомай арыстакратычнай сям'і, яе бацька быў камергерам імператара Аўстра-Венгрыі. Яе сын Юзэф так пісаў пра яе ва ўспамінах пра жыццё ў Прылуках: «Яркі дыван з цёмным малюнкам, і я гуляю на ім з кубікамі. Маці сядзіць побач у фатэлі ці за столікам-бюро (чырвонае дрэва і пазалочаны з бронзы канцік), пах гіяцынтаў у вазонах, які садоўнік прыносіў увесну, шмат сонца. Залатаруды бляск валасоў маці на сонцы. Ці мне гэта сёння толькі здаецца? Абсалютнае і «назаўсёды» пачуццё абароненасці, шчасце». Юзэфа была лагоднай, веручай. Які там раман з селянінам? Да таго ж памерла ў 1903-м пры нараджэнні восьмага дзіцяці.

У 1925-м Ежы Чапскі ажаніўся з Палінай Аненкавай — імя нібыта тое... Але і яна наўрад ці падыходзіць на ролю закаханай у жаўнера Тамаша з суседняй вёскі, хоць бы таму, што яны з графам ажаніліся ўжо пасля рэвалюцыі, калі Чапскі страціў Прылукі і з'ехаў у Польшчу.

А сямейнае паданне, мусіць жа, існуе, у яго шчыра вераць. Хто забіў таго Тамаша, што за дзяўчына засілілася? Няпэўная катэгорыя — людская памяць...

### ГАЎЛЯЙТАР І КАЛАРАДСКІ ЖУК

У 1920-я замак быў прыстасаваны пад санаторый ЦК КП(б)Б. Перад вайной тут быў дом адпачынку НКУС. А падчас Вялікай Айчыннай вайны рамантычны палац забраў пад летнюю рэзідэнцыю гаўляйтар Вільгельм Кубэ. Жонка Кубэ ўспамінала, што яны там часта ладзілі прыёмы... Вось тут разгуляцца б прывідам супраць злыдняў-прыхадняў! Чорная дама ў Нясвіжы палохала ж акупантаў... Звестак пра подзвігі прывідаў няма, а вось у 1944-м палац згарэў.

Пасля вайны ён быў адноўлены, і ацалеў, як кажуць, дзякуючы каларадскаму жуку — якраз пачалі актыўна з ім змагацца, і ў Прылуках пасяліўся навукова-даследчы інстытут аховы раслін, створаны на базе Мінскай навукова-даследчай станцыі па каларадскім жуку, нематодах і раку бульбы. Знаходзіцца там інстытут і цяпер. Кажуць, ёсць тут і будыначак, дзе за савецкім часам месцілася так званая глушылка супраць варожых радыёстанцый.

А ці блукаюць па ваколіцах прывіды — уявіце самі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

# СЛОВА ПАМЯЦІ ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

**Напярэдадні 77-й гадавіны вызвалення Беларусі і Дня Незалежнасці свет убачыла чарговае перавыданне кнігі «Ніколі не забудзем» праекта Беларускага саюза жанчын «Сямейнае чытанне». Выданне прэзентавалі ў рамках круглага стала па тэме «Сямейнае чытанне як фактар умацавання маральных каштоўнасцяў і пераемнасці пакаленняў». Пагаварылі глабальна не толькі пра чытанне і ўплыў на дадзены працэс сям'і, але і закранулі куды больш надзённыя і актуальныя тэмы, сярод якіх памяць пра Вялікую Айчынную вайну, перапісванне гістарычнай праўды і недапушчэнне рэабілітацыі нацызму, каб успаміны пра тыя часы сталі вывучаным і засвоеным урокам для цяперашніх і будучых пакаленняў.**




— Праект «Сямейнае чытанне» Беларускага саюза жанчын быў адкрыты яшчэ ў 2019 годзе напярэдадні такой знакавай даты 75-годдзя вызвалення Беларусі. І цяпер, калі мы ўжо прадстаўляем трэцюю кнігу гэтага праекта, то вельмі ўдзячныя за партнёрства ў ім беларускім выдавецтвам, Міністэрству інфармацыі, Міністэрству адукацыі. І думаю, што ў такіх праектах мы будзем пашыраць кола нашых удзельнікаў, бо яны накіраваны на развіццё і ўмацаванне духоўных, сямейных каштоўнасцяў, на патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, — адзначыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, саветнік ГА «Беларускі саюз жанчын» Лілія АНАНІЧ.**

Абмеркаванне важных тэм, сярод якіх і выхаванне падрастаючага пакалення, павага да роднай зямлі і захаванне памяці пра яе герояў, а таксама ўздзеянне мастацкага слова на фарміраванне асобы, вядома, былі ў цэнтры. Аднак усе прысутныя сышліся на думцы, што пачынаецца ўсё з сям'і, бо менавіта там закладваюцца любоў, традыцыі і тыя духоўныя і маральныя асновы, па якіх потым можна арыентавацца ў жыцці і ў любой інфармацыйнай прасторы. Кніга «Ніколі не забудзем», можа, і з'яўляецца адным з такіх указальнікаў. Упершыню яна з'явілася ў 1948 годзе і да цяперашняга перавыдання мае ўжо доўгае жыццё. З прачытання аднаго з твораў «Страшны дзень», у якім апісваецца адна з гісторый знішчэння беларускай вёскі немцамі, літаральна і пачалася яе прэзентацыя...

— Я прачытаў гэтую кнігу першы раз, калі мне было дзесяць гадоў. Тое савецкае выданне не мела такой шыкоўнай белай паперы, але ў ім былі яскравыя ілюстрацыі. Я іх і да сёння памятаю. У маленстве ўсё абвострана ўспрымаецца. А сёння многія рэчы, якія пасля ўсіх гэтых інфармацыйных выбухаў, натуралізацыі, пpackазу нейкіх жахаў, што называецца, на экране камп'ютара, не глядзяцца так і не здаюцца такімі жудаснымі, якімі яны былі насамрэч. У гэтай кніжцы вытрымана самае галоўнае — з аднаго боку, тут паказана простымі беларускімі словамі, вельмі простымі, дзіцячымі словамі, трагедыя. Без натуралізацыі, без нейкіх нялюдскіх эфектаў, з максімальнай ашчадлівасцю да іншых. А з другога боку, гэта шчымлівая праўда, — кажа **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар МАРЗАЛЮК.** — Вось тое, як апісана ў гэтым апавяданні знішчэнне вёскі, тая методыка, якая апісаная там, калі спачатку заходзяць у хату і выбіваюць усіх жывых, а потым паляць, — гэта традыцыйнае, стандартнае знішчэнне. Мы проста мусім памятаць, што калі 22 чэрвеня 1941 года пачалася аперацыя «Барбароса» (гэта з улікам усіх тых рэфлексій і таго галашэння, тых зняважлівых, абразлівых у дачыненні да нас і да нашай дзяржавы выказванняў, аб тым, што мы выдумляем генацыд), я проста нагадаю, што, згодна з нямецкім стандартным планам, да 22 чэрвеня 1941 года была «звычайная еўрапейская вайна», і зусім іншая — пасля 22 чэрвеня. Па-нямецку яна называлася «расавая ідэалагічная вайна». У першую чаргу гэта была вайна на знішчэнне.

Кожны твор у кнізе «Ніколі не забудзем» прасякнуты болем дзяцей вайны, якія зведалі яе жахі, страты блізкіх людзей... І калі такое выданне папоўніць сямейныя, школьныя бібліятэкі, то працягнецца якраз тая пераемнасць пакаленняў, якія памятаюць, наколькі высокую цану заплаціла наша краіна за тыя ліхалецці і як важна, каб падобнай жудасці не паўтаралася.

— Беларускі саюз жанчын мае вялікую гісторыю, якая непарыўна звязана з тэмай вайны. І таму мы сёння тут. БСЖ — гэта амаль нашчадкі Антыфашысцкага камітэта савецкіх жанчын, які быў арганізаваны ў 1941 годзе. Мы сёння адна з тых грамадскіх арганізацый, якія ставяць сваімі галоўнымі мэтамі падтрымку сям'і, падтрымку дзяцей, захаванне нашых традыцыйных сямейных каштоўнасцяў і нашай духоўнай спадчыны. І сёння мы не маем права маўчаць, — дзеліцца **старшыня ГА «Беларускі саюз жанчын» Алена БОГДАН.**

Кніга «Ніколі не забудзем» сёлета выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». І, як адзначыў яго **дырэктар Алесь БАДАК,** з'явілася яна вельмі своечасова і заўсёды будзе актуальная і запатрабаваная:

— Такія кніжкі павінны быць пастаянна ў кнігарнях. Больш за тое — яны павінны быць пастаянна ў школе. Дзеці сёння, на жаль, часцей любяць слухаць сваіх равеснікаў, чым настаўнікаў, бацькоў. Таму спадзяюся, што гэтая кніга ёсць ва ўсякім разе ў пазакласным чытанні, але яе трэба чытаць на ўроках. Гэтая кніжка ўнікальная, таму што ва ўсім свеце падобнага выдання няма. І, улічваючы, як цяпер развіваецца свет, нічога падобнага і не будзе, мы жывём іншымі праблемамі. Гэтая кніжка ўнікальная тым, што яе агульны тыраж на сённяшні дзень ужо большы за мільён асобнікаў. Кніжка, якую напісалі дзеці. Але я хацеў бы звярнуць увагу яшчэ на пераемнасць пакаленняў. Кніжка задумвалася ў 1944 годзе, то-бок руіны, есці няма чаго, а ўжо працуе дзіцячая газета «Піянер Беларусі» і ўжо дарослае кіраўніцтва краіны думае пра дзяцей. Дзякуючы Анастасіі Рокаш, якая прыдумала гэты праект, які падтрымалі беларускія пісьменнікі Якуб Колас, Янка Маўр, камсамол і маладыя, юныя журналісты, мы маем кнігу ўспамінаў. Але яна ўнікальная не толькі тым, што напісаная дзецьмі, а і тым, што тут адказнасць за кожнае слова: з якім болем і, разам з тым, з якой пяшчотай яно зроблена. Тут няма нічога выпадковага. У выніку атрымалася кніжка, якая жыве ўжо столькі дзесяцігоддзяў і, думаю, будзе жыць яшчэ доўга.

Варта адзначыць, што кніга «Ніколі не забудзем» уключана ў лік сацыяльна значных выданняў. І, па словах **намесніка міністра інфармацыі Ігара БУЗОЎСКАГА,** сёння вельмі важна, каб такія тэмы не абміналіся ўвагай, каб пра гэта задумваліся кожны раз, калі кніга трапляе ў рукі.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

100 БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# БДУ, 1943 год, эвакуацыя...

## Дэлегацыя БДУ наведала станцыю «Сходня» пад Масквой і магілу першага рэктара

**Менавіта на станцыі «Сходня» 11 кастрычніка 1943 года студэнты і супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта пасля двухгадовага перапынку з-за пачатку Вялікай Айчыннай вайны прыступілі да навучальнага працэсу.**




Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава перадаў БДУ вялікую колькасць вучэбнага і навуковага абсталявання, падручнікаў і наглядных дапаможнікаў, 18 тысяч тамоў навуковай літаратуры. Заняткі праводзіліся на шасці факультэтах прыкладна для 300 студэнтаў. Навучальны працэс забяспечвалі 90 выкладчыкаў.

Будынак, дзе праходзілі заняткі, знаходзіцца на месцы аднаго з сучасных карпусоў Расійскай міжнароднай акадэміі турызму. У 2011 годзе на будынку была ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў памяць аб падзеях 1943 года.

Візіт на станцыю «Сходня» сімвалічны тым, што прайшоў напярэдадні святкавання 3 ліпеня — Дня Незалежнасці Беларусі. У гэты дзень у 1944 годзе Мінск быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а 22 кастрычніка гэтага ж года ў беларускую сталіцу прыбыў эшалон, у якім ехалі выкладчыкі і студэнты БДУ, там жа знаходзілася навучальнае і навуковае абсталяванне. З гэтага часу і пачалося аднаўленне галоўнага беларускага ўніверсітэта.

Наведванне станцыі «Сходня» адбылося ў рамках прымеркаванага да 100-годдзя БДУ візіту дэлегацыі ВНУ ў Маскву. Таксама студэнты і супрацоўнікі наведалі на Новадзявочых могілках магілу Уладзіміра Іванавіча Пічэты, першага рэктара Белдзяржуніверсітэта, акадэміка Акадэмій навук БССР і СССР, выбітнага гісторыка і славіста. Удзельнікамі цырымоніі сталі прадстаўнікі МДУ, беларускай дыяспары ў Расіі і духавенства.

Над пахаваннем устаноўлены двухметровы манумент з белага мармуру з бюстам славутага навукоўца-гісторыка. Вобраз зняты з фота перыяду рэктарства Пічэты ў БДУ. Аўтарам помніка з'яўляецца мастак-скульптар Маргарыта Удальцова, жонка заслужанага дзеяча навукі РСФСР і рэктара МДУ ў 1928—1930-х гадах Івана Удальцова. Уладзімір Пічэта быў настаўнікам іх сына Івана і сябрам сям'і.

Бюст на магіле першага рэктара выраблялі па гіпсавым варыянце, які прадаставіла жонка навукоўца Аляксандра Пятроўна Пічэта. З ёй у 1956—1965 гадах кіраўніцтва БДУ вяло перапіску, у якой абмяркоўваліся нюансы матэрыялу для будучага помніка, яго цана, а таксама кандыдатуры майстроў і скульптараў.

Пахаванне Уладзіміра Пічэты знаходзіцца пад патранажам магістрантаў-гісторыкаў БДУ і МДУ, якія навучаюцца ў сумеснай магістратуры. Валанцёры штогод займаюцца яго добраўпарадкаваннем, абнаўляюць надпісы і чысцяць помнік.

У БДУ аддаецца асаблівая ўвага гістарычнай памяці заснавальніка ўніверсітэта. На фасадзе «Дома № 1 БДУ», дзе некаторы час жыў і працаваў Уладзімір Пічэта, ёсць мемарыяльная дошка. Сёння гэта корпус гістарычнага факультэта БДУ, тут жа знаходзіцца бюст Уладзіміра Пічэты і адкрыта імянная аўдыторыя навукоўца.

З імем Уладзіміра Іванавіча звязана станаўленне беларускай савецкай гістарычнай навукі, гісторыі права і эканомікі. Тэмы яго даследаванняў уключалі пытанні этнагенезу беларускага народа, гісторыі беларускіх гарадоў, археалогіі і краязнаўства, гісторыі беларускай мовы і літаратуры. З 500 работ вучонага больш як 150 прысвечаны гісторыі Беларусі.

Уладзімір Пічэта памёр у 1947 годзе ва ўзросце 68 гадоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С.В. извещает о проведении 20 июля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80 % (лоты №№ 2, 3, 4), на 30 % (лот № 5) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условия продажи:** **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Лоты, расположенные на земельном участке с кадастровым номером **340100000002000638** площадью **2,0237 га,** предоставлены ОАО «Гомельский рыбокомплекс» на праве постоянного пользования. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст. 19, 45 «Кодекса Республики Беларусь о земле» установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки), через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. **4.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | | |
| **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16 | | | | |
| 2 | ТУ (теплоузел 11, инв. № 0023). Ворота металлические с ограждением (инв. № 1000). Ограждение (забор кирпичный, инв. № 1002). Проезжая часть (асфальтовое покрытие, инв. № 1008) | **190 760,00** | 9 538,00 | 19 076,00 |
| 3 | Склад ГСМ (инв. № 0025). Склад (инв. № 0024). Трансформаторная подстанция (ТТП) (инв. № 0026). Склад (инв. № 0027). Склад (инв. № 0035). Эстакада (инв. № 0037) | **13 980,00** | 699,00 | 1 398,00 |
| 4 | Склад (инв. № 0032). Склад (инв. № 0031). Склад (инв. № 0030). Склад (инв. № 0028). Навес (инв. № 0033). Навес (инв. № 0029) | **50 280,00** | 2 514,00 | 5 028,00 |
| 5 | **ДЕБИТОРСКАЯ ЗАДОЛЖЕННОСТЬ:** Речицкое РАЙПО (УНП 400037088) | **4 214,73** | 210,74 | 421,47 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 733-03-49, управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 июля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 16 июля 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.02.2021 г. № 34 (29403). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38 Тел. + 375 29 688-04-88** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 33**

**Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денежн. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева/охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 183 830,40 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 9 191,52 бел. руб.**

**Лот № 2 (одним лотом)**
Местоположение **– Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| **Изолированное помещение № 1** (производственное помещение) | 206,3 кв. м | 600/D-91728 | 3А-4 |
| **Изолированное помещение № 2** (административное помещение) | 221,7 кв. м | 600/D-91729 | 3А-4а |
| **Изолированное помещение № 3** (производственное помещение) | 288,4 кв. м | 600/D-91730 | 3А-4б |
| **Административное помещение** | 233,6 кв. м | 600/D-40239 | 3-5 |
| **Административное помещение** | 83,9 кв. м | 600/D-40241 | 3-6 |
| **Складское помещение** | 205,2 кв. м | 600/D-40243 | 3-7 |

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 2 391 600,00 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 119 580,00 бел. руб.**

**Лот № 3**
Местоположение **– г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Помещение санитарно-бытового назначения** | 1,7 кв. м | 500/D-7028275 |

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 4 440,00 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 222,00 бел. руб.**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию, +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам № 1, 3; 3 % – по лоту № 2) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.05.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **22.07.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
